Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 МАЯ 2016 г. СУБОТА № 86 (28196) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Дарагія суайчыннікі!**

*Сардэчна віншую вас з Днём Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.*

*Гэта гістарычная дата вось ужо 71 год з'яўляецца для нашага народа адной з самых светлых, урачыстых і значных. Мы аддаём даніну глыбокай павагі гераізму і самаадданасці абаронцаў Айчыны, а слаўны подзвіг воінаў і працаўнікоў тылу назаўсёды застанецца ў памяці ўдзячных нашчадкаў.*

*Беларусь першая прыняла на сябе страшны ўдар ворага, стаўшы жывым шчытом на шляху вераломнага агрэсара. У адзіным страі з брацкімі народамі Савецкага Саюза беларусы самааддана ішлі да доўгачаканай Перамогі, вызваляючы родную зямлю і краіны Еўропы ад фашысцкага прыгнёту, а вярнуўшыся да мірнага жыцця, аднавілі разбураныя гарады і спаленыя вёскі.*

*У гэты святочны дзень самыя цёплыя словы ўдзячнасці мы адрасуем нашым ветэранам, якія вынеслі ўвесь цяжар ваеннага ліхалецця. Дзякуй вам і нізкі паклон!*

*Мы будзем вечна помніць і свята шанаваць імёны мільёнаў — тых, хто змагаўся за незалежнасць Айчыны, хто працаваў не шкадуючы сіл на шляху да гэтай вялікай мэты.*

*Шчыра жадаю ўсім добрага здароўя, шчасця і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# Мы выжылі. Мы перамаглі. Мы памятаем




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ДВА, бадай што, самыя народныя святы сышліся сёлета ў календары — Дзень Перамогі і Радаўніца. У іх, па сутнасці, шмат агульнага — бурная радасць вясны і жыцця, удзячнасць за вясну і жыццё тым, каго ўжо няма з намі, светлы сум і пачуццё еднасці з тымі, хто ляжыць у гэтай зямельцы, палітай іхнім потам і крывёю.

Можа, дзякуючы гэтай удзячнасці і еднасці на нашай зямлі няма непрыбраных салдацкіх магіл. Чырвонаармеец Сцяпан памёр ад атрыманых ран у вёсцы Ражава пад Нароўляй у першыя месяцы вайны — летам 41-га. Вяскоўцы не ведалі нават яго прозвішча, але пахавалі на могілках і паставілі помнік.

Жыхары Ражава і іх нашчадкі бываюць на могілках рэдка, наездамі — трыццаць гадоў назад вёску, да якой ад Чарнобыля 15 кіламетраў, адсялілі. Але магіла Сцяпана без увагі не застаецца ніколі. Летась, напрыклад, наш фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук сфатаграфаваў, як яе добраўпарадкавалі Людміла і Васіль МОЦІКІ з дачкой Ганнай з Нароўлі.

Сёлета на Радаўніцу да Сцяпана таксама хтосьці абавязкова прыйдзе. Прыбраць магілу, падзякаваць за мірнае неба, павіншаваць з Днём Перамогі, які і ён крыху прыблізіў у ліпені 41-га.

ISSN 1990 - 763X

## СВЯШЧЭННЫЯ СІМВАЛЫ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Дарагія суайчыннікі!**

*Сардэчна віншую вас з Днём Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.*

*Герб, сцяг і гімн увасабляюць ідэалы і прынцыпы нашай маладой суверэннай краіны — мір, працу, добрасуседства, сацыяльную справядлівасць, вернасць сваім духоўным каштоўнасцям і традыцыям.*

*Гэтыя свяшчэнныя сімвалы дзяржаўнасці звязваюць разам усё самае для нас дарагое: гераічныя здзяйсненні продкаў, дасягненні цяперашняга пакалення і тыя вяршыні, якія дружнай сям'і мільёнаў беларусаў трэба пакарыць у будучыні.*

*Гэта ўрачыстасць напоўнена асаблівай актуальнасцю і глыбокім сэнсам. Паколькі мы адзначаем яе напярэдадні важнай гістарычнай даты — 25-годдзя незалежнасці Беларусі.*

*Упэўнены, што гэтыя знакавыя падзеі паслужаць яшчэ большай з'яднанасці грамадства, росту патрыятычнай свядомасці і дапамогуць нашаму народу ўпэўнена рухацца па шляху далейшага стварэння і прагрэсу.*

*Ад усёй душы жадаю вам, дарагія суграмадзяне, моцнага здароўя, дабрабыту, аптымізму і плённай дзейнасці дзеля працвітання роднай зямлі.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# ЯКАСЦЬ — РУХАВІК ПРАГРЭСУ

### Айчынныя вытворцы ўступілі ў паласу жорсткай канкурэнцыі

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка наведаў ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Мінскі маторны завод».**

Кіраўнік дзяржавы працягвае наведваць прамысловыя гіганты краіны. Знаходзячыся на Мінскім маторным заводзе, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў хуткім часе на асобнай нарадзе будуць разглядацца пытанні аўтамабілебудавання. Цяпер спецыялісты вядуць глыбокую прапрацоўку гэтай тэмы, каб вырашыць існуючыя праблемы і атрымаць у выніку добры канкурэнтаздольны прадукт у выглядзе аўтамабіля, трактара і гэтак далей. «У бліжэйшыя год-два мы будзем мець поўны камплект вытворчасці ўласных аўтамабіляў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што выпрацоўка праграмы па аўтамабілебудаванні не будзе зацягвацца. «У гэтай праграме вялікае месца займае наш рухавік. Патрэбны новыя, — сказаў Прэзідэнт. — На Мінскім маторным заводзе вырабілі шмат доследных узораў. Трэба хутчэй іх правяраць і запускаць у серыйную вытворчасць». Гэта гарантуе перспектыву прадпрыемству.

«2016 год — гэта год праверкі на трываласць усіх прадпрыемстваў краіны, асабліва такіх гігантаў, да якіх адносіцца і Мінскі маторны завод», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. У гэтым пераліку таксама МАЗ, БелАЗ, МТЗ, «Гомсельмаш» і іншыя прадпрыемствы, якія, паводле слоў Прэзідэнта, «мы не можам страціць, гэта брэнд нашай краіны».

Разважаючы з працоўным калектывам, кіраўнік дзяржавы адзначыў, стан спраў на заводзе цяпер небездакорны, але галоўнае — тут разумеюць, як рухацца далей, паведамляе БЕЛТА. Ён падкрэсліў, што галоўнае для завода, як і для іншых прадпрыемстваў, — гэта якасць.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускія вытворцы ўступілі ў паласу жорсткай канкурэнцыі. Каб выпускаць тавар, прывабны па цане і якасці, патрэбна строгая дысцыпліна, дыктатура тэхналогіі, упэўнены Прэзідэнт. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што строгая дысцыпліна не падразумявае таго, што камусьці трэба закрываць рот. «Чалавек мае права сказаць усё, што ён думае аб палітыцы, унутранай і знешняй, на прафсаюзным або агульным сходзе, які праводзіцца для адкрытай размовы», — адзначыў ён. Аднак на канвееры не павінна быць ніякай палітыкі. «Тут палітыка адна — якасць», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Прадстаўнікі працоўнага калектыву папрасілі ў кіраўніка дзяржавы пракаментаваць паведамленні, што ва ўрадзе Расійскай Федэрацыі ствараецца навукова-тэхнічны савет, прызначаны каардынаваць развіццё вядучых прадпрыемстваў па вытворчасці рухавікоў і тэхнікі. Работнікаў завода цікавіла, ці не прывядзе гэта да дыскрымінацыі для вытворцаў з Беларусі. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што беларуская прадукцыя і ў далейшым будзе запатрабавана ў Расіі. Для гэтага неабходна высокая якасць тавараў, каб забяспечыць попыт не толькі ў расійскіх, але і ў іншых замежных пакупнікоў.

Працаўнікі Мінскага маторнага завода пацікавіліся ў Прэзідэнта, што трэба, каб павысіць статус рабочых спецыяльнасцяў. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Каб павысіць статус любой прафесіі, трэба ствараць дастойнае рабочае месца для чалавека і плаціць яму тое, што ён зарабляе. Будуць рабочае месца і добрая зарплата — любы малады чалавек пойдзе і будзе працаваць». Няўхільнае патрабаванне Прэзідэнта пры падрыхтоўцы любых спецыялістаў — улічваць іх далейшую запатрабаванасць у народнай гаспадарцы. «Рабочыя спецыяльнасці — гэта аснова ўсяго, таму мною пастаўлена задача аптымізаваць прафтэхадукацыю, зняць усё лішняе ў гэтай сістэме навучання. Пры гэтым патрэбна больш цесная, эфектыўная сувязь з вытворчасцю».

Закрануў Прэзідэнт і тэму Дня Перамогі. «Мы сёння жывём на сваім кавалачку зямлі, і гэта дзякуючы тым, хто змагаўся супраць ворага і заваяваў Перамогу. Таму не трэба саромецца аддаваць даніну павагі тым, хто загінуў, і тым, хто выжыў у гэтай нялёгкай барацьбе», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы сказаў, што 9 мая, у Дзень Перамогі, разам з беларускім народам будзе адзначаць гэта свята. Раніцай адбудзецца ўскладанне вянкоў да манумента Перамогі. Пройдзе шэсце «Беларусь памятае» з удзелам грамадскасці і прадстаўнікоў маладзёжных арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў. Вечарам адбудзецца вялікі канцэрт, прысвечаны святу.

V Усебеларускі народны сход

■ Ёсць такі вопыт

# ЭКАНОМНАЯ АРЫФМЕТЫКА

**У найбліжэйшай перспектыве ў Мінскай вобласці, бадай, не застанецца ні аднаго неўладкаванага аб'екта сацыяльнай сферы. У рэгіёне шырока распаўсюджаная практыка рамонту школ, бальніц, паліклінік, дамоў культуры, стадыёнаў, плавальных басейнаў, спартыўных залаў гаспадарчым спосабам. Сутнасць яго ў тым, што работы вядуць за кошт сродкаў, якія выдзяляюцца з абласнога і раённых бюджэтаў.**

Такі метад практыкавалі на Гродзеншчыне ў той час, калі вобласцю кіраваў цяперашні старшыня Мінаблвыканкама Сямён Шапіра. Па яго ініцыятыве вопыт перанеслі і на цэнтральны рэгіён. За кошт бюджэтных сродкаў кіраўнікі ўстаноў набываюць будаўнічыя матэрыялы, наймаюць спецыялістаў па дагаворах падраду, якія ў азначаныя тэрміны якасна выконваюць работы.

Рамонт сацыяльных аб'ектаў гаспадарчым спосабам у разы зніжае затраты: не патрабуюцца паслугі будаўнічых арганізацый, самі наймальнікі выбіраюць матэрыялы, шпалеры, фарбу, плітку. Толькі ў Слуцкім раёне такім чынам адрамантавалі больш як 100 школьных класаў. У некаторых дырэктараў бліскуча праявіліся якасці менеджараў. Хтосьці змог прывесці ў парадак некалькі памяшканняў, а нехта — і цэлыя паверхі. Самі кіраўнікі сцвярджаюць: калі прадоўжыць такую практыку, то праз 3-4 гады можна абнавіць усе школы.

У Мінскай вобласці летась на рамонт сацыяльных аб'ектаў гаспадарчым спосабам было выдзелена 300 млрд рублёў. Сёлета запланавана столькі ж, адзначыў Сямён Шапіра.

— Рамонт гаспадарчым спосабам цалкам сябе апраўдаў, — лічыць **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінаблвыканкама Святлана БАРАНОК.** — Напрыклад, у Беразіне на прывядзенне ў парадак аб'ектаў культуры такім чынам затрачана больш як 1 млрд 187 млн рублёў. Непазнавальна змяніўся раённы Цэнтр культуры, у тым ліку метадычны і мастацкі кабінеты, фасад будынка. У раённым Цэнтры культуры Нясвіжа зроблена ўрачыстая зала для рэгістрацыі шлюбаў, уладкаваны маладзёжны цэнтр. Сёлета работы прадоўжацца, на рамонт аб'ектаў культуры Міншчыны па дагаворах падраду выдзелена 20 млрд рублёў.

Многія лячэбныя ўстановы не абнаўляліся працяглы час, як, напрыклад, хірургічнае аддзяленне Стаўбцоўскай раённай цэнтральнай бальніцы — 40 гадоў. Па праекце на рэканструкцыю тут планавалася больш як 9 млрд рублёў. Капітальны рамонт гаспадарчым спосабам праведзены за 5 месяцаў і абышоўся ў 1,8 млрд рублёў.

— Толькі за апошнія пяць гадоў на капітальны рамонт, рэканструкцыю, набыццё сучаснага абсталявання для ўстаноў аховы здароўя горада Жодзіна затрачана 111 млрд рублёў. Як вынік, значна зменшыўся ўзровень першаснах захворванняў. У Жодзінскай цэнтральнай гарадской бальніцы працягваецца капітальны рамонт, у тым ліку і гаспадарчым спосабам. Дзякуючы рэканструкцыі аперацыйнага блока створана пяць аперацыйных, што дазволіла размеркаваць паток пацыентаў для планавых, экстранных, траўматалагічных і гінекалагічных аперацый і давесці іх колькасць да дзвюх з паловай тысяч за год. Медыкі асвоілі шмат новых тэхналогій, укаранілі больш як 120 методык лячэння.

— У нас уведзены ў дзеянне новы тэрапеўтычны корпус, — падзялілася **галоўны ўрач установы Таццяна НІКІФАРАВА.** — Ён размясціўся асобна ад бальніцы. Акрамя таго, на працягу апошніх гадоў значна абнавіўся парк тэхнікі, закуплена 8 аўтамабіляў хуткай дапамогі, у тым ліку рэанімабіль, што дало магчымасць рабіць аперацыі ў машыне. І гэта вельмі важна, паколькі бываюць выпадкі, калі шанцы на выратаванне жыцця вымяраюцца хвілінамі. Цяпер ідзе рэканструкцыя былога інфекцыйнага корпуса. Сюды перавядуць бальніцу сястрынскага догляду. Пацыенты будуць пражываць выключна ў палатах, разлічаных на двух чалавек. У будынку створаць безбар'ернае асяроддзе.

У Клецкім раёне такім метадам прывялі ў парадак фізкультурна-аздараўленчы комплекс. Як сцвярджае **старшыня райвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ,** летась на яго рэканструкцыю затрацілі каля 1 млрд 300 млн рублёў: замянілі плітку ў басейне і раздзявалках, адрамантавалі саўну. Гэта дазволіла павысіць кошт паслуг, за дадатковыя сродкі быў куплены новы інвентар, у прыватнасці 15 пар канькоў.

Значна папрыгажэў, абнавіўся і раённы Цэнтр культуры. Яго пабудавалі яшчэ ў 1994 годзе, і з таго часу тут не было капітальнага рамонту. Цяпер можна толькі меркаваць, які непрэзентабельны выгляд меў будынак.

— Сюды мы перанеслі кінатэатр, які размяшчаўся асобна. Палічылі, што капітальна адрамантаваць гэтае памяшканне надта стратна. У Цэнтры мы абсталявалі ўтульную глядзельную залу на 50 пасадачных месцаў, фільмы дэманструюцца ў фармаце 3D. Гэтага цалкам дастаткова для такога невялікага гарадка, як Клецк, — расказала **дырэктар установы культуры Галіна КРУК.** — Акрамя таго, у памяшканні зрабілі кафэ, якое, мяркую, прыцягне новых наведвальнікаў. Тут можна будзе ладзіць урачыстасці, сямейныя святы. За два гады ў рамонт мы ўклалі 1 млрд 800 млн рублёў.

Рамантуецца Цэнтр паэтапна. Сёлета на чарзе другі паверх. Заяўлена 1 млрд 530 млн рублёў бюджэтных грошай — менавіта столькі трэба, каб усё давесці да ладу. За кошт асабістых сродкаў, а гэта каля 40 млн рублёў, ужо ўладкавалі гасцініцу.

— Наш край вельмі пявучы, толькі на базе Цэнтра працуюць 7 «народных» і «ўзорных» калектываў. У перспектыве яшчэ два плануюць пацвердзіць гэтае званне. Мы вядзём актыўную канцэртную дзейнасць не толькі на Клеччыне, але і выязджаем у іншыя раёны: Стаўбцоўскі, Капыльскі, Нясвіжскі, Ляхавіцкі, — канстатуе Галіна Крук. — У нас таксама пабывалі многія беларускія зоркі, вядомыя калектывы, усе яны выступаюць на платнай аснове, а білеты сяроод жыхароў мы распаўсюджваем самі. Ладзім і акцыі, праводзім розныя мерапрыемствы ў арганізацыях, на прадпрыемствах. Сродкі ад пазабюджэтнай дзейнасці трацім на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

На падыходзе — рамонт гаспадарчым спосабам гарадскога стадыёна, адрамантаваны аддзяленне хуткай дапамогі раённай цэнтральнай бальніцы, іншыя дапаможныя памяшканні, сярэдняя школа №1 — адна з самых буйных у раёне, дзе вучацца каля 500 вучняў.

— Перавага капітальнага рамонту па грамадзянска-прававых актах відавочная, эканомія бюджэтных сродкаў у залежнасці ад складанасці работ — 20-40 працэнтаў, — лічыць **намеснік старшыні райвыканкама па сацыяльнай сферы і ідэалагічнай рабоце Генадзь БУЙВІЛА.** — Сёлета таксама працягнем гэтую работу. Пэўныя напрацоўкі і вопыт у нас ёсць.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■

## ПАДРЫХТОЎКА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

**На гэтым тыдні адбылося трэцяе пасяджэнне арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы 5-га Усебеларускага народнага сходу. Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі дэталі будучай падзеі, паведамляе тэлеканал «СТБ».**

У праграме навін «24 гадзіны» на СТБ нагадалі, што Усебеларускі народны сход пачнецца 22 чэрвеня, а гэта — памятны дзень. Сёлета адзначаецца 75-годдзе пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Былі выказаны прапановы, каб падчас сходу дэлегаты наведалі музей Вялікай Айчыннай вайны, а ў канцэртнай праграме гучалі песні ваенных гадоў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Грошы

# ДЭПАЗІТЫ БОЛЬШ НЕ КРАНУЦЬ

### Далейшага інтэнсіўнага зніжэння працэнтных ставак сёлета не плануецца

**Аб гэтым учора паведаміў на прэс-канферэнцыі старшыня праўлення Нацыянальнага банка Павел КАЛАУР, які прагназуе сёлета спакойную сітуацыю на рынку ўкладаў.**

**Банкам давяраюць**

Ён нагадаў, што на дэпазітным рынку ў сакавіку і красавіку назіраецца станоўчая дынаміка тэрміновых укладаў насельніцтва ў нацыянальнай валюце (плюс 425,4 млрд рублёў і 237,4 млрд рублёў адпаведна). «Сумы невялікія, але ва ўмовах падзення рэальных даходаў насельніцтва (па нашых ацэнках, за першы квартал сёлета яно склала 6,2%) чакаць інтэнсіўнага росту ўкладаў было б, напэўна, не зусім апраўдана», — лічыць кіраўнік Нацбанка.

Не чакаецца экспертамі рэгулятара і значнага ажыўлення дэпазітнага рынку і ў цэлым па годзе, што тлумачыцца з практычна нейтральнай пазіцыі па змяненні рэальных наяўных даходаў насельніцтва. Павел Калаур акцэнтаваў увагу, што перадумоў для значных ваганняў на дэпазітным рынку цяпер няма. «Уклады не будуць зніжацца, але яны і не будуць расці», — прагназуе ён.

З 1 мая стаўка рэфінансавання ў Беларусі знiжана на 2 працэнтныя пункты да 22% гадавых. Адначасова адбылося і зніжэнне працэнтных ставак на дэпазітах. Старшыня праўлення Нацбанка падкрэсліў, што гэта рашэнне з'яўляецца абгрунтаваным і своечасовым. «Больш інтэнсіўнае зніжэнне працэнтных ставак на фоне насцярожанага ўспрымання эканамічнымі суб'ектамі дзеянняў манетарных уладаў, на наш погляд, можа справаваць адток сродкаў з банкаўскай сістэмы, — адзначыў Павел Калаур. — Найбольш уразлівае і мабільнае ў гэтым аспекце насельніцтва, удзельная вага дэпазітаў якога ў шырокай грашовай масе складае каля 60%.

«Мы прынялі для сябе стратэгію паступовага зніжэння ставак у эканоміцы і маем намер яе прытрымлівацца. Гэта дазваляе нам даць сігнал удзельнікам эканамічных адносін аб пазітыўнай ацэнцы рэгулятарам развіцця сітуацыі ў грашова-крэдытнай сферы і адначасова не справакаваць дэстабілізацыю на фінансавых рынках. Праз уздзеянне такім чынам на чаканне мы паэтапна спрыяем памяншэнню рызыка-прэміі, якую закладваюць насельніцтва і прадпрыемствы пры размяшчэнні грашовых сродкаў у банках», — дадаў Павел Калаур.

Ёсць і іншыя абмежаванні для значнага зніжэння працэнтных ставак. У першую чаргу гэта рост праблемных актываў, які цягне за сабой недаатрыманне даходаў па дрэнных крэдытах і неабходнасць стварэння банкамі спецрэзерваў. Яшчэ адным стрымліваючым фактарам з'яўляецца высокая доля льготных крэдытаў у крэдытным партфелі банкаў.

**Валюту ўжо больш прадаюць**

Паводле слоў Паўла Калаура, цяпер прапанова валюты перавышае попыт. Калі ў студзені людзі на чыстай аснове купілі 189 млн долараў, то ў наступныя месяцы насельніцтва ўжо стала чыстым прадаўцом. За першы квартал года агульны аб'ём прададзенай замежнай валюты з боку насельніцтва перавысіў долю яе набыцця ўжо на 148 млн долараў. У апошнія месяцы пачалі больш прадаваць замежнай валюты і суб'екты гаспадарання, адзначае рэгулятар. Сальда інтэрвенцый Нацбанка па выніках 4 месяцаў было станоўчым і склала 237 млн долараў.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■

■ Медыяпрастора

# Адкрыты фармат патрабуе прафесіяналаў

**З 11 па 14 мая ў Мінску будуць праходзіць два знакавыя для айчыннай медыяпрасторы мерапрыемствы — выстава «СМІ ў Беларусі» і XI Беларускі міжнародны медыяфорум «Партнёрства дзеля будучыні». Напярэдадні гэтага своеасаблівага «тыдня журналістыкі» міністру інфармацыі Ліліі АНАНІЧ «Звязда» задала пытанні не толькі пра маючыя адбыцца мерапрыемствы, але і пра тое, як не прайграць у інфармацыйнай вайне, чаго не хапае нашым «раёнкам» і як будуць асвятляцца будучыя выбары.**



Фота Надзеі БУЖАН.

***— Лілія Станіславаўна, пачатак мая для журналісцкай супольнасці заўсёды звязаны з прафесійнымі святамі — Днём друку і Днём радыё і тэлебачання, уручэннем узнагарод — «Залатой ліцеры» і «Тэлевяршыні», традыцыйнай ужо выставай «СМІ у Беларусі». Сёлета да ўсяго вышэйпералічанага далучана яшчэ адно значнае мерапрыемства — XI Беларускі міжнародны медыяфорум «Партнёрства дзеля будучыні», які звычайна праводзіўся ў іншы час. Падобнае сумяшчэнне патрабуе нейкага адмысловага фармату правядзення выстаўкі і медыяфоруму. Мы сапраўды станем сведкамі нечага прынцыпова новага?***

— У прынцыпе, падобны фармат сапраўды новы. Сумясціць два мерапрыемствы, у якіх традыцыйна прымаюць удзел прадстаўнікі медыйнай прасторы з Беларусі і краін блізкага і далёкага замежжа, здалося цікавай ідэяй. У гэтага агульнага па сутнасці мерапрыемства, безумоўна, будзе большы маштаб, большая прадстаўнічасць. Удзельнікі форуму, напрыклад, будуць прысутнічаць на ўрачыстым адкрыцці выставы, пазнаёмяцца з экспазіцыямі, якія прадстаўяць на ёй рэспубліканскія, рэгіянальныя і замежныя сродкі масавай інфармацыі. Разлічваем, што з улікам гэтага рэдакцыі сёлета падыдуць да афармлення і тэматычнай насычанасці сваіх стэндаў асабліва творча, каб годна прадставіць сябе і чытачам-гледачам, і шматлікім замежным гасцям. Чакаецца шмат цікавых прэзентацый, імпрэз, у тым ліку з удзелам вядомых артыстаў, пісьменнікаў, мастакоў... А міжнародны медыяфорум стане пляцоўкай для зацікаўленага дыялогу прафесіяналаў на надзённыя для грамадства тэмы. І журналісты, якія будуць прэзентаваць плён сваёй працы на выставе, змогуць папрысутнічаць на дыскусіях форуму, паўдзельнічаць у іх. Такі вось цікавы насычаны «мікс», які, мяркую, многім калегам прыйдзецца даспадобы.

***— Але міжнародны фармат абодвух мерапрыемстваў, несумненна, захаваецца. Каго з замежных гасцей мы чакаем сёлета?***

— На форум прыедуць, без перабольшвання, госці з усяго свету. Чакаем удзельнікаў з Азербайджана, Арменіі, Бельгіі, Грузіі, Ізраіля, Казахстана, Кітая, Кыргызстана, Латвіі, Літвы, Малдовы, Сербіі, ЗША, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана, Узбекістана, Украіны, Фінляндыі, Эстоніі. Гаспадары форуму таксама будуць браць актыўны ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах, бо тэмы, прапанаваныя для абмеркавання, надзвычай актуальныя і для нашага грамадства.

***— Летась, у год 70-годдзя Вялікай Перамогі, гаварылі пра адказнасць журналістаў, пра тое, як захаваць гістарычную праўду. На што будзе звернута асаблівая ўвага гэтым разам?***

— Лейтматывам дыскусій форуму і выстаўкі будзе развіццё інфармацыйнай прасторы суверэннай Беларусі ў кантэксце сучаснага грамадска-палітычнага і гуманітарнага парадку дня. Паразважаем і пра адказнасць. Не толькі на старонках і на сайтах выданняў, але і ў сацыяльных сетках, якія ўжо фактычна становяцца самастойнымі і ці не самымі папулярнымі СМІ. Не забыліся мы і пра 25-годдзе СНД, 20-годдзе саюзнага будаўніцтва. Тым больш што наша краіна годна прадстаўлена ў гэтых і ў іншых інтэграцыйных структурах, з'яўляецца ініцыятаркай многіх лёсавызначальных рашэнняў у іх. У гэтым юбілейным кантэксце мы зноў будзем гаварыць не толькі аб прафесійным — аб чалавечым. «СМІ як інструмент дыялогу, міру і стваральнасці» — так гучыць адна з прапанаваных для абмеркавання тэм.

***— Мяркую, што на дыскусійных пляцоўках і сёлета не раз узнікне тэма вайны — інфармацыйнай. Тэма надзвычай актуальная на сённяшні дзень, яе агучваў падчас Паслання беларускаму народу і парламенту Прэзідэнт краіны, асабліву ўвагу надаўшы сродкам масавай інфармацыі. На думку міністра інфармацыі, што трэба найперш зрабіць у айчыннай медыясферы, каб не прайграць гэту вайну з самага пачатку?***

— Лічу, што перамагчы ў ёй дапаможа толькі прафесіяналізм і, зноў жа, адказнасць. Нярэдка ў пагоні за сенсацыяй, за інфармацыяй, якую будуць каментаваць у сецыве, некаторыя калегі па журналісцкім цэху грэбуюць не толькі аб'ектыўнасцю — элементарнай прыстойнасцю. Тое самае можна сказаць і пра блогераў, якіх многія ўжо схільныя вылучаць у асобную кагорту журналістаў. У асяроддзі гэтых вольных мастакоў, як правіла, усім незадаволеных, пра адказнасць, пра неабходнасць правяраць здабытую інфармацыю, можа, нават і не чуў ніхто... Але нашы спажыўцы інфармацыі вельмі чуйныя да падману, таму «сенсацыі» застаюцца сенсацыямі вельмі нядоўга — людзі проста перастаюць імі цікавіцца. Дапытлівы чытач, «злавіўшы» фальшыўку, чакае працягу — кампетэнтнага тлумачэння, як яно было на самай справе, абгрунтаванага погляду. Вось тут і патрэбны спецыялісты, прафесіяналы — не толькі журналісты, але і палітолагі, і сацыёлагі, і дасведчаныя ў розных сферах навукоўцы. Адным словам, эксперты, якія граматна і паслядоўна выказваюць свае думкі, вартыя даверу. Такія людзі ў нас ёсць, але ў медыяпрасторы не заўсёды прадстаўлены належным чынам.

***— Кіраўнік дзяржавы ў кантэксце інфармацыйнага супрацьстаяння акцэнтаваў увагу на неабходнасці мабілізаваць рэгіянальныя СМІ. Там не хапае прафесіяналаў ці ў іх супрацоўнікаў проста «комплекс правінцыі»?***

— Хапае і прафесіяналаў, і тэхнічнае забеспячэнне ў многіх на ўзроўні. І перспектывы ў рэгіянальных СМІ добрыя — яны папулярныя ў чытачоў, бо паведамляюць навіны аб знаёмых людзях — тое, пра што не пачытаеш ні ў цэнтральных газетах, ні ў сецыве. Праўда, здараецца, што за гэтымі мясцовымі навінамі не бачаць больш глыбокай праблемы, больш актуальнай тэмы. З іншага боку, разумееш, што «раёншчыкам» часам цяжка самім зрабіць складана, што ім патрэбна дапамога і падказка. І вельмі добры памочнік тут — партал «СМІ Беларусі», які акумулюваў сайты рэспубліканскіх і рэгіянальных выданняў і служыць сапраўднай пляцоўкай для абмену творчым досведам.

***— Напярэдадні вельмі значная ў жыцці краіны кампанія — выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Важная дэталь іх правядзення — даступнасць і разнастайнасць інфармацыі. Напрацаваны вопыт асвятлення леташняй прэзідэнцкай кампаніі можа стаць тут узорам ці варта шукаць нейкія новыя формы і хады?***

— Сапраўды, апошняя прэзідэнцкая кампанія стала для дзяржаўных СМІ своеасаблівым іспытам, які, лічу, быў годна вытрыманы. Яны спакойна, падрабязна асвятлялі ўсе этапы выбараў, аддавалі належную ўвагу ўсім кандыдатам. Несумненна, вопыт такой канструктыўнай працы варты ўвасаблення падчас сёлетніх выбараў. Але шукаць новыя хады і формы газетам і тэлерадыёканалам давядзецца хаця б таму, што кандыдатаў у дэпутаты парламента будзе значна больш. Так што, мяркую, нас чакае шмат цікавых і арыгінальна пададзеных новых матэрыялаў.

***— Вяртаючыся да тэмы прафесіяналаў у медыяпрасторы. Нацыянальныя конкурсы «Залатая ліцера» і «Тэлевяршыня» праводзяцца ўжо больш за дзесяць гадоў: ці не стала цяжэй вызначаць новых лаўрэатаў і пераможцаў?***

— А іх вызначаць ніколі лёгка не было — штогод шмат цікавага, творчага, таленавітага падаецца на гэтыя конкурсы. Таму журы, калі і адчувае цяжкасці, дык ад таго, што ёсць з чаго выбіраць... Зрэшты, самым лепшым доказам маіх слоў будзе прынцып «лепш адзін раз убачыць». Прасачыце, чые імёны трапяць сёлета ў спіс узнагароджаных, а пасля пагладзіце сюжэты, знятыя гэтымі людзьмі, пачытайце напісаныя імі публікацыі. Я гарантую: больш вы не будзеце сумнявацца ў патрэбе найвышэйшых журналісцкіх узнагарод і ў справядлівасці іх размеркавання.

**Пытанні задавала Алена ЛЯЎКОВІЧ.**
*alena@zviazda.by*

■ Не абмініце!

## ЗА ПАДПІСКУ — ШАРЖ!

**Экскурсія ў мінулае газеты «Звязда», канцэрт спявачкі індыйскіх песень і шарж ад вядомага мастака — у прэзентацыйнай праграме нашага Выдавецкага дома на выстаўцы «СМІ ў Беларусі — 2016».**

На форуме беларускіх СМІ, што пройдзе ў выставачным цэнтры «БелЭкспа» (пр-т Пераможцаў, 14) з 11 па 14 мая, самы «калючы» часопіс Выдавецкага дома «Вожык» прапануе наведвальнікам незвычайную акцыю. Кожны, хто падпішацца на гэты гумарыстычны часопіс, атрымае арыгінальны шарж-партрэт ад вядомага мастака Аляксандра Каршакевіча. Аформіць падпіску і атрымаць шарж можна з 11 па 13 мая з 13 да 14 гадзін. Таксама «Вожык» прапануе сваім прыхільнікам пазнаёміцца з іншымі вядомымі мастакамі — Мікалаем Гіргелем і Сяргеем Волкавым.

З 11 па 14 мая на стэндзе Выдавецкага дома будуць праходзіць аўтограф-сесіі нашых аўтараў, мультымедыяпрэзентацыі перыядычных выданняў — газет «Звязда» і «Літаратура і мастацтва», часопісаў «Полымя», «Бярозка», «Нёман», «Вожык», «Алеся», «Родная прырода». Хочаце пазнаёміцца з любімым журналістам, атрымаць аўтограф, зрабіць сэлфі? Завітвайце да нашага стэнда. Таксама будзе зладжаная экспазіцыя газеты «Звязда» з сімвалічнай назвай «І слова кавала перамогу».

А сапраўдным падарункам ад жаночага часопіса «Алеся» стане канцэрт адзінай у краіне спявачкі, якая выконвае індыйскія песні, Святланы Агарвал. Ён пройдзе на галоўнай сцэне выставачнага комплексу. Сачыце за праграмай і не прапусціце! Таксама чытачоў «Алесі» чакаюць прэзентацыя часопіса і віктарына з прызамі.

Запрашаем на сустрэчу сваіх сталых і новых чытачоў!

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■ Перадсвяточнае

## КУРГАН СЛАВЫ БУДЗЕ АСВЯТЛЯЦЦА КРУГЛАСУТАЧНА

**На мемарыяльным комплексе сёння запрацуе сонечная фотаэлектрычная станцыя. Устаноўка дазволіць асвятляць курган увесь дзень.**



«Станцыя стане своеасаблівым падарункам ветэранам ад Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі да 71-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Падсветка прыдасць кургану сучасны і велічны выгляд», — адзначылі ў ФПБ.

Сёння ж на цэнтральнай пляцоўцы мемарыяла Федэрацыя прафсаюзаў, Міністэрства адукацыі, Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў, БРСМ і піянерская арганізацыя падпішуць Пагадненне аб намерах супрацоўніцтва ў сферы грамадзянска-патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання дзяцей і моладзі. Адкрыецца таксама інтэрактыўны «Музей-бус».

## ВЕТЭРАНАМ — ПАШАНА І ПАДЗЯКА

**Найбольш запатрабаваным сярод пажылых людзей застаецца абслугоўванне на даму. У першым квартале гэтага года «пад крылом» сацыяльных работнікаў былі 2 тысячы 133 ветэраны. 46 ветэранаў атрымлівалі паслугі сядзелкі.**

Тым, хто мае патрэбу ў пастаянным староннім доглядзе, прапануюць пасяліцца ў стацыянарных установах. На сёння ў дамах-інтэрнатах пражывае 125 ветэранаў і 126 грамадзян, якія пацярпелі ад наступстваў вайны. **Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр Румак** адзначыў, што чэргаў у дамы-інтэрнаты агульнага тыпу цяпер няма. Для засялення дастаткова сабраць толькі неабходныя дакументы.

Усяго ў рэспубліцы пражывае 13,7 тысячы ветэранаў, з іх 9 тысяч — інваліды і ўдзельнікі вайны. Самаму маладому ўдзельніку Вялікай Айчыннай — 91 год. У жывых засталіся два Героі Савецкага Саюза. Колькасць грамадзян, што пацярпелі ад наступстваў вайны, — 23,8 тысячы чалавек.

Аляксандр РУМАК таксама сказаў, што сярэдняя пенсія інваліда вайны перавышае 5 мільёнаў.

Ветэранам вайны ўстаноўлены надбаўкі ў памеры ад 50 да 500 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце. Максімальная даплата — 2 мільёны 124 тысячы. Апроч гэтага, пажылыя людзі атрымліваюць і ўзроставыя бонусы. Для тых, хто дасягнуў 80 гадоў, гэта павышэнне ў памеры мінімальнай пенсіі — амаль 425 тысяч рублёў. Таксама грамадзянам, старэйшым за 80 гадоў, належыць надбаўка на догляд (яе сума цяпер складае 212 тысяч).

— Летась, калі адзначаўся юбілей Перамогі, дзяржавай былі зроблены істотныя выплаты ветэранам. Тады аднаразовую матэрыяльную дапамогу атрымалі 44,3 тысячы чалавек. Агульная сума склала 205,5 мільярда рублёў. У гэтым годзе такія выплаты не прадугледжваюцца, — адзначыў Аляксандр Румак. — Але ветэраны атрымліваюць матэрыяльную дапамогу з іншых крыніц. Напрыклад, са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны. Таксама, згодна з сёлетнім указам Прэзідэнта №78, абласныя і раённыя Саветы дэпутатаў маюць права аказаць сацыяльную падтрымку за кошт мясцовых бюджэтаў. І кожны рэгіён з улікам сваіх магчымасцяў такія выплаты праводзіць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## АДВАЖНЫ ТАНКІСТ

У Мінску ўшанавалі памяць Героя Савецкага Саюза

**Каля мемарыяльнай дошкі Герою Савецкага Саюза Наджафгулу РАФІЕВУ ў Мінску, адрэстаўраванай з нагоды 71-й гадавіны Вялікай Перамогі, адбыўся мітынг-рэквіем. Пасольства Азербайджана, азербайджанская дыяспара ўшанавалі памяць свайго земляка. Выказалі даніну павагі герою і ветэраны, проста ўдзячныя мінчане.**

Напярэдадні вайны Рафіеў скончыў Ленінградскую вышэйшую бранятанкавую школу. У свой першы бой з гітлераўцамі ўступіў ужо 26 чэрвеня 1941 года ва Украіне. Баявое майстэрства танкіста праявілася пад Жытомірам і Харкавам. Толькі ў адным баі пад Палтавай вайскоўцы Рафіева вывелі са строю два цяжкія нямецкія танкі і шэсць гармат, знішчылі больш як 50 гітлераўскіх салдат. Падчас бітвы ў раёне Мацвеева Кургана Рафіеў быў паранены трэці раз. І зноў застаўся на полі бою. Экіпаж азербайджанца знішчыў варожы танк, дзве цяжкія гарматы, мінамёт і 35 гітлераўцаў. За мужнасць і адвагу танкіст быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Асабліва вызначыўся Рафіеў у баях за вызваленне Беларусі. Пад камандаваннем камандзіра танкавага ўзвода танкісты авалодалі пераправай цераз раку Пціч, што пад Бабруйскам, на шашы Бабруйск — Глуск не далі адысці працiўніку. Праследуючы ворага, яго салдаты ўварваліся ў населены пункт Леніна, што ў Горацкім раёне Магілёўскай вобласці. А 8 ліпеня 1944 года танкісты Рафіева першымі ўвайшлі ў Баранавічы. 26 верасня 1944 года за ўзорнае выкананне заданняў камандавання і праяўленую мужнасць і гераізм у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі малодшаму лейтэнанту Рафіеву прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза.

І пасля вайны адважны танкіст не здрадзіў афіцэрскім пагонам. Жыў і працаваў у Баку. Там у 1970 годзе і пайшоў з жыцця. Яго імя носіць вуліца не толькі ў Мінску, а і на радзіме героя. У 1969 годзе Рафіеў стаў ганаровым грамадзянінам Глуска — каля якога адважна змагаўся.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

# ЭКСПАНАТ — НАЙБОЛЬШ ДАКЛАДНЫ ДАКУМЕНТ

**Беларусь стала першай краінай у свеце, якая стварыла музей Вялікай Айчыннай вайны. Прычым экспазіцыю пачалі збіраць у адзін з самых цяжкіх яе перыядаў — калі Беларусь знаходзілася пад акупацыяй. Амаль кожны прыносіў свае рэчы, баявыя трафеі — музей, па сутнасці, ствараўся ўсім народам.**

**Вельмі сімвалічна, што ў год святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў музей набыў новы дом. Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця, якая адбылася 2 ліпеня 2014 года, прынялі ўдзел Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін. І тут таксама — не без сімволікі: менавіта разам з братнім рускім народам мы здабылі такую цяжкую, але вельмі патрэбную Вялікую Перамогу.**

**Новы музей ужо ахрысцілі Храмам памяці. Дзякуючы вялікай працы і прафесіяналізму шырокага кола людзей, у ім створана экспазіцыя, якая аб'ектыўна расказвае аб гераічных і трагічных падзеях у лёсе не толькі Беларусі, а і ўсяго свету. Штомесяц музей наведвае ў сярэднім 30 тысяч чалавек.**

**Цягам года на старонках газеты «Звязда» была ажыццёўлена віртуальная экскурсія, якая ахапіла ўсе музейныя залы. Спадзяёмся, пасля нашых публікацый у вас з'явілася жаданне ўбачыць усё на свае вочы і асабіста прайсці «шляхам да Перамогі».**

**Для таго, каб абмеркаваць важнасць дадзенага праекта ў кантэксце патрыятычнага выхавання моладзі, напярэдадні 71-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў «Звяздзе» прайшоў «круглы стол» пад назвай «Экспанат — найбольш дакладны дакумент». У ім прынялі ўдзел дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук, член-карэспандэнт Аляксандр КАВАЛЕНЯ, старшы навуковы супрацоўнік аддзела ваенна-франтавой гісторыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Сяргей КЛЮЦКІ, загадчык аддзела ваеннай гісторыі Беларусі і міждзяржаўных адносін Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Аляксей ЛІТВІН, загадчыца аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Галіна ПАЎЛОЎСКАЯ, намеснік дырэктара Нацыянальнага гістарычнага музея Аляксандр ХРАМЫ.**


Аляксандр КАВАЛЕНЯ.


Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ.


Аляксандр ХРАМЫ.


Галіна ПАЎЛОЎСКАЯ.

## «У кожнай вёсцы ёсць свой герой»

**Аляксандр Каваленя:** — Сёння назіраецца празмерная міфалагізацыя падзей Вялікай Айчыннай вайны. За апошні час ужо столькі створана міфаў, што нам неабходна разбірацца. Аб'ектыўна паказвае падзеі экспазіцыя музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Ёсць здаровы баланс экспанатаў, якія яскрава адлюстроўваюць гераізм, мужнасць, самаадданасць і самаахвярнасць беларускага народа ў гады вайны.

**Галіна Паўлоўская:** — У зале музея, якая распавядае аб акупацыйным рэжыме на Беларусі, частка экспазіцыі прысвечана такой з'яве, як калабарацыя. Мы не можам адмаўляць, што гэта было, што ў знішчэнні беларускіх вёсак прымалі ўдзел паліцыянты з ліку нашых землякоў. Замоўчваць гэта нельга: міфы не павінны перабольшваць рэальнасць. Старэйшаму пакаленню замест «калабарант» больш знаёма слова «здраднік». Я ж для сябе зрабіла адзіны вывад — у фашызму няма нацыянальнасці.

**Вячаслаў Даніловіч:** — Аб'ектыўнасць ужо апрыёры мае на ўвазе тое, што падзея павінна паказвацца так, як яна адбывалася. І калі мы кажам пра фашызм, то ў першую чаргу неабходна паказваць, якія вынікі гэтай ідэалогіі былі для нашага народа, што фашысты ўчынілі на нашай зямлі. Акрамя таго, на значныя, глабальныя працэсы супрацьстаяння трэба глядзець шырэй і бачыць, на што яны былі накіраваны. Фактычна Германія выкарыстоўвалася як супрацьвага Савецкаму Саюзу. Заходнія краіны імкнуліся сутыкнуць гэтыя дзве сілы, каб аслабіць іх і, адпаведна, павялічыць свой уплыў у свеце. Сёння не сакрэт, што вельмі шмат для ўмацавання ідэалогіі фашызму і прыходу да ўлады нацыстаў у Германіі зрабілі так званыя краіны заходняй дэмакратыі. Сваім патураннем, фінансаваннем адраджэння германскай прамысловасці. І калі мы будзем глядзець на тэму калабарацыі з гэтага пункту гледжання, то нам стане зразумела, што гэта быў шлях у тупік.

**Галіна Паўлоўская:** — Асноўныя пытанні, якія наведвальнікі задаюць пасля выхаду з залы акупацыі, заснаваны на ўражаннях, што зрабіў фашызм на нашай зямлі. Іх уражваюць трагедыя Трасцянца, першыя публічныя пакаранні на вуліцах Мінска, гета, лагеры для ваеннапалонных, а не тое, што яны даведаліся пра калабарацыю. Іншаземцы пад уплывам убачанага нават мяняюць свой пункт погляду на Другую сусветную вайну.

**Аляксандр Каваленя:** — Падчас міжнароднага форуму «Вялікая Перамога, здабытая адзінствам», які днямі адбыўся ў Мінску, сабраліся прадстаўнікі амаль усіх краін былога Савецкага Саюза. Яны наведалі музей. Мяне вельмі разанула выступленне доктара навук з Латвіі. Ён сказаў, што самым вялікім недахопам нашага музея з'яўляецца тое, што ў ім не паказаны літоўскія і латышскія ваенна-паліцэйскія батальёны, якія чынілі злачынствы на беларускай зямлі. І сёння прадстаўнікі гэтых фарміраванняў маршыруюць па вуліцах Украіны і іншых краін. Чаму мы, дзеці тых, хто змагаўся з германскім нацызмам, саступаем пальму першынства нашчадкам паліцэйскіх? Нам варта падхапіць эстафету, распачатую Расіяй, «Бессмяротны полк». Неабходна актывізаваць выхаваўчую работу ў школах, дашкольных установах, каб дзеці ганарыліся сваімі дзядамі і прадзедамі, якія стаялі ля вытокаў разгрому нацысцкай Германіі.

**Аляксей Літвін:** — Асноўным недахопам савецкага перыяду было тое, што мы імкнуліся выхоўваць падрастаючае пакаленне на нечым агульным. А выхоўваць трэба з каранёў кожнага чалавека. Ніколі чалавек не зразумее сусветнай гісторыі, пакуль не будзе ведаць гісторыю сваёй сям'і. Трэба ведаць і калабарантаў. Чаму? Я нейкім чынам вінаваты, што гэты тэрмін пачаў гуляць па краіне. Савецкая ўлада не выпадкова не выкарыстоўвала гэтае слова, бо для нас яно не зусім адпавядала сутнасці. У чым прыкмета калабаранта? Гэта еднасць нацыянал-сацыялізму з фашызмам. У любой вайне былі здраднікі, былі тыя, хто ваяваў за грошы. А тут людзі ішлі з ідэйных матываў і лічылі, што нацыянал-сацыялізм — гэта новая Еўропа. Такіх у нас было мала. Гэта былыя беларускія нацыяналісты, якія ваявалі з савецкай уладай з 1917 года. Але нягледзячы на негатыўныя выкіды і так званыя белыя плямы, мы не толькі захавалі сваю гісторыю, а і развілі яе.

**Аляксандр Каваленя:** — Нашы апаненты звязваюць калабарацыянізм з існаваннем савецкай камуністычнай сістэмы. А як жа ўзнікла такая з'ява ў Францыі, дзе не было сацыялізму? У іншых краінах Еўропы? А колькі ў партызанскіх атрадах было камандзіраў, якія прайшлі праз сталінскія лагеры? Тым не менш яны самаахвярна ваявалі на баку Чырвонай Арміі, адстойваючы савецкую сістэму. Таму, сапраўды, падрастаючае пакаленне неабходна выхоўваць на прыкладах мясцовых герояў. Каб яны ведалі, дзе адбываліся баі, дзе знаходзіліся партызанскія зямлянкі. А такіх месцаў у Беларусі не тое што мноства, у кожнай вёсцы ёсць свае героі. І менавіта аб гэтых людзях неабходна расказваць. Ніякім чынам нельга дэвальваваць нашу гісторыю і прыніжаць уклад беларускага народа ў Вялікую Перамогу.

**Вячаслаў Даніловіч:** — Вельмі важны і істотны момант — гэта захаванне спецкурсу па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Гэтыя падзеі займаюць адно з ключавых месцаў у нашай дзяржаўнай ідэалогіі. Яны найбольш блізкія да нас па часе, у іх выразна праявіўся патрыятызм нашых продкаў. Я згодзен з тым, што ў патрыятычным выхаванні мы павінны працаваць з самага пачатку: з сям'і, садка, школы. Але вельмі важна, каб была пляцоўка, на якой школьнікі маглі б расказаць пра сваіх гераічных продкаў, прыняць удзел у навуковых форумах. У плане аб'ектыўнасці і пашырэння беларускага погляду на гістарычныя падзеі, у тым ліку на Другую сусветную вайну, вельмі важным аспектам з'яўляецца міжнароднае супрацоўніцтва, рэалізацыя сумесных навуковых праектаў.

**Аляксандр Храмы:** — Каб аб'ектыўна паказваць гісторыю, галоўнае для нас — працаваць над экспазіцыяй. Ніякай гераізацыі фашызму ў беларускіх музеях не існуе, яе проста не можа быць. Увогуле, пазбегнуць гераізацыі фашызму можна не замоўчваючы праблему, а наадварот, як і ў журналістыцы, заўсёды быць на вастрыні гэтай тэмы. Задача музея — каб людзі, якія прыязджаюць у Беларусь, бачылі пазіцыю суверэннай дзяржавы, наш погляд на гісторыю, наш боль. Калі так і будзе, не ўзнікне ніякай гераізацыі і сам па сабе музей застанецца актуальным, а грамадства адчуе, што ён патрэбен.

**Сяргей Клюцкі:** — Музей гістарычны — гэта візуалізацыя гісторыі, у адрозненне ад уласна гісторыі як аповеду. І калі пэўную тэму можна расказаць у межах нейкага курсу, то далёка не кожную можна давесці да наведвальніка праз экспазіцыю.

## «Сучасныя тэхналогіі гавораць на мове моладзі»

**Аляксандр Храмы:** — Экспанат нічым замяніць немагчыма. Калі няма экспанатаў, фактычна няма музея. Сучасныя тэхналогіі — дадатковы матэрыял, які перадае толькі аўтэнтыку гэтага прадмета, дадае новае адчуванне экспаната. Калі казаць пра камп'ютарныя тэхналогіі, то яны якраз гавораць на той мове, на якой сёння размаўляе моладзь. Калі гэтага не ўлічваць, то музей для новых пакаленняў будзе нецікавы. Сёння мы можам працаваць і віртуальна. Большасць турыстаў ужо прызвычаіліся загадзя планаваць сваё падарожжа і яшчэ да ад'езду ўважліва вывучаць магчымасці і якасці паслуг як краіны і горада, так і асобнага музея. І толькі пасля гэтага прымае рашэнне аб турыстычным маршруце і наведванні ў тым ліку музея. Калі ўсё гэта сучасны музей не будзе выкарыстоўваць, то ён страціць 2/3 сваіх наведвальнікаў. Не варта таксама забывацца, што сучасныя тэхналогіі дапамагаюць нам захаваць тое, што мы ў любы час можам страціць.

**Аляксей Літвін:** — Музей — адукацыйная, культурная ўстанова, якая павінна працаваць не толькі з сучаснымі тэхналогіямі, але і паводле сучасных прынцыпаў. У якую краіну я б ні прыехаў, заўсёды іду ў музей. Трэба сказаць, што мы трошкі напярэдзе ў былым Савецкім Саюзе. Хоць бы таму, што першымі стварылі музей. Але нас увесь час абыходзяць. Апошнім часам музеяў па Другой сусветнай вайне набудавалі ў Германіі, у Польшчы. Пераважаюць тэхналогіі, зробленыя ўхіл на тое, як моладзь сёння ўспрымае гісторыю. Таму не павінна быць прапаганды. Мы толькі тады прасунемся наперад, калі будзем глыбока ведаць сваю гісторыю.

**Вячаслаў Даніловіч:** — Беларусь фактычна адзіная сёння краіна, якая стварыла цалкам абноўлены музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. І вельмі важна, што наш музей спалучае і сучасныя тэхналогіі, і рэчы таго часу. Знойдзена аптымальнае, на мой погляд, спалучэнне.

**Сяргей Клюцкі:** — Не заўжды кожны экспанат ёсць дакумент. Калі ж браць дакумент, то гэта якраз самы нявыгадны экспанат. Ён не валодае той атракцыйнасцю, якая патрэбна большасці звычайных наведвальнікаў. Зрабіць візуальна прывабным дакумент складана, бо дакумент — тое, што трэба ў першую чаргу чытаць, а далёка не ўсе дакументы аднолькава прыдатныя для зроку. І аднаго дакумента ніколі не дастаткова. Для адэкватнага адлюстравання рэчаіснасці павінна быць нейкая паліфанія дакументаў і іншых прадметаў. Каб давесці пэўныя дакументы да наведвальніка, трэба прыкласці шмат розных намаганняў. Таксама трэба ўлічваць, што кожны дакумент мае сваю матэрыяльнасць. А для музейшчыка гэта вельмі важна. Змест дакумента — адно, артэфактнасць — крыху іншае. Калі мы робім экспазіцыю, павінны давесці і фізічны выгляд гэтага прадмета. А ён не заўжды адэкватны для ўспрымання. А музей — заўжды эстэтычная з'ява. Калі музей не можа захапіць наведвальніка, ён у прынцыпе нічога не можа давесці. Ён павінен захапіць, але ён не можа проста забаўляць. Геданістычнае — тое, што ў асноўным прыводзіць наведвальнікаў у музей, — павінна пераўтварацца ў асветніцкае.

**Галіна Паўлоўская:** — Экспазіцыя нашага музея шматузроўневая. Малодшым школьнікам цікава пабачыць гарматы, танкі, самалёты, інсталяцыі, дыярамы, пачуць просты аповед пра падзеі Вялікай Айчыннай. Дакументы, вядома, — для дарослага, падрыхтаванага ў той ці іншай меры наведвальніка.

**Аляксандр Каваленя:** — У сваёй аснове экспазіцыя музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны павінна яскрава дэманстраваць, што Савецкі Саюз пераміг фашысцкую Германію. Неабходна прадставіць усе адпаведныя дакументы і прадметы ваенных гадоў. Толькі зрабіць гэта так, каб з усёй відавочнасцю прадэманстраваць, што Чырвоная Армія разграміла армію, лепшую ў свеце.

## «У дачыненні да прадметаў лічбавая інфармацыя другасная»

**Вячаслаў Даніловіч:** — Калі мы гаворым пра праламленне нашых навуковых даследаванняў у музейнай экспазіцыі, то павінны гэта рабіць разам з музейшчыкамі. Паасобку зрабіць гэта аб'ектыўна і атракцыйна мы не зможам.

**Аляксей Літвін:** — Гісторыю Вялікай Айчыннай вайны 20 гадоў пасля яе заканчэння фактычна не вывучалі ўвогуле. Яе вывучэнне больш-менш пачалося толькі тады, калі святкавалі 20-годдзе Вялікай Перамогі. Але маса праблем увогуле не разглядалася. Гэта тычыцца і тэмы спаленых вёсак. Калі паставілі помнік у Лідзіцэ, толькі тады нашым кіраўнікам стала зразумела, што такое Лідзіцэ ў параўнанні з нашымі тысячамі вёсак. Пасля дазволілі стварыць помнік у Хатыні.

**Сяргей Клюцкі:** — Перш чым любы прадмет з'явіцца ў экспазіцыі, павінна быць праведзена грунтоўная навуковая работа. Мы вызначаем, якую частку быцця людзей павінна раскрыць тая ці іншая крыніца ў экспазіцыі. Музей усё ж такі прадстаўляе лёсы людзей, тыя сляды, якія ад іх засталіся: праз іх прадметы, асабістыя рэчы. Лічбавая інфармацыя важная, але ў дачыненні да прадметаў другасная.

## «Галоўнае — захаваць»

**Галіна Паўлоўская:** — Музейная экспазіцыя не ствараецца аднойчы і назаўсёды. Музей — жывы арганізм. Праца па напаўненні экспазіцыі Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны новымі экспанатамі

## Выхоўваць падрастаючыя пакаленні варта праз гісторыю сваёй сям'і


Аляксей ЛІТВІН.


Сяргей КЛЮЦКІ.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

працягваецца. У апошні час скончана афармленне асобнай вітрыны, прысвечанай Пятру Міронавічу Машэраву, насычаюцца інфармацыяй аўдыя- і відэакіёскі. Напрыклад, прадстаўлены спісы спаленых беларускіх вёсак. Але не ўсё так добра, як хацелася б. Наш музей налічвае больш за 146 тысяч адзінак захоўвання. З 30 калекцый толькі 14 маюць фондасховішчы. Астатнія захоўваюцца ў прыстасаваных памяшканнях.

**Аляксандр Храмы:** — Ні Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, ні музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны сёння не маюць спецыялізаваных памяшканняў, якія можна было б назваць дэпазітарыем. Сённяшнія фонды знаходзяцца ў прыстасаваным памяшканні, дзе прадметы захоўваюцца ў патрэбным тэмпературным і вільготнасным рэжыме, але з імі немагчыма працаваць, і таму яны не могуць прыносіць грамадству аніякай карысці. Дэпазітарый — гэта як рэанімацыя ў бальніцы, нават хірургія, дзе ўсе працуюць у стэрыльным, каб не парушыць мікраклімат. У дэпазітарыі можна рабіць аблічбоўку, рэстаўрацыю і нават праводзіць экскурсіі. Спадзяёмся, што з цягам часу сітуацыя палепшыцца.

**Галіна Паўлоўская:** — У нас ніколі не састарэюць інфакіёскі. Наш фонд складаецца з прадметаў, дакументаў, фотадакументаў, якія перадаюць нам у дар сем'і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Калі нашчадкі прыходзяць у музей і пытаюцца, дзе могуць пабачыць матэрыялы родных, даводзіцца тлумачыць, што кожнага немагчыма паказаць у экспазіцыі. Таму інфакіёскі — выхад. Яны могуць утрымліваць вялікую колькасць інфармацыі, дазваляюць увесь час яе папаўняць. Такім чынам, мы самі ствараем сваю музейную Кнігу памяці. Па-другое, аблічбоўка пісьмовых і аўдыявізуальных крыніц, наяўнасць іх у электронным варыянце гарантуе захаванасць нашых фондаў.

### «Музей павінен жыць»

**Аляксандр Храмы:** — Сёння сярод моладзі карыстаюцца папулярнасцю квэсты. Спачатку я адносіўся да іх як да забаўляльнага мерапрыемства, пакуль сам не паспрабаваў свае сілы ў гульні. Сучасныя людзі настолькі загружаныя інфармацыяй, што часта не ўспрымаюць тэкст. У асноўным прыходзяць у музей, каб атрымаць эстэтычны досвед. Але выйшаўшы з пэўнай залы, некаторыя нават не разумеюць, у якім стагоддзі «пабывалі», якую падзею вывучалі. Квэст жа задае дакладнае пытанне, адказ на якое трэба знайсці ў экспазіцыі. А гэта патрабуе пэўных інтэлектуальных высілкаў, якія прымушаюць уважліва прагледзець усю экспазіцыю. Больш таго, новыя формы дазваляюць праводзіць маніторынг і атрымліваць адваротную сувязь.

**Галіна Паўлоўская:** — Акрамя правядзення экскурсій, самастойнага агляду экспазіцыі і выстаў, мы прапануем іншыя формы знаёмства з музеем. Практыкуецца правядзенне экскурсій па фондах з паказам фондавых калекцый (так званыя адкрытыя фонды), працуе музейная тэматычная фотазона, дзе можна зрабіць здымак у адпаведным вайсковым антуражы і не толькі. Падчас розных свят працуюць майстар-класы па вырабе дызайнерскіх паштовак і плакатаў. На пляцоўцы перад музеем і ў музеі ў такія дні адбываюцца выступленні творчых калектываў. Не адно святкаванне Дня Перамогі не абыходзіцца без палявой кухні з салдацкай кашай. У планах — музейныя заняткі на спецыяльных пляцоўках у экспазіцыі, так званых педагагічных станцыях.

**Сяргей Клюцкі:** — Сапраўды, інфатэрміналы пашыраюць магчымасці. Наведвальнік, напрыклад, не зможа пагартаць арыгінальныя рукапісныя часопісы, музейная калекцыя якіх мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі № 1. У электронным жа варыянце гэта магчыма. Так, некаторыя рэчы дзякуючы сучасным тэхналогіям становяцца даступнымі для ўсіх наведвальнікаў, калі раней яны былі недасягальнымі.

**Аляксандр Каваленя:** — Нямала ў экспазіцыі дакументаў і па тэме партызанскага руху. Вядома, такую колькасць старонак тэксту ў музеі ніхто не будзе чытаць. Трэба знайсці такую форму падачы, каб гэта зацікавіла чалавека і ён захацеў падрабязна азнаёміцца з дакументамі.

**Вячаслаў Даніловіч:** — Самае істотнае, што музей працуе як своеасаблівы грамадскі цэнтр. Ён не толькі прымае наведвальнікаў, як звычайны музей. Тут праводзяцца канферэнцыі, мерапрыемствы, розныя навуковыя дыскусіі. Гэта неабходна, бо музей павінен жыць. І павінен несці наш, беларускі, погляд на ваенныя падзеі. Я глыбока перакананы, што на любую гістарычную падзею мы павінны глядзець вачыма свайго народа.

**Вераніка КАНЮТА.**
kanyuta@zviazda.by

■ Стоп-кадр

# ТОЙ, ХТО БРАЎ БЕРЛІН

## Карэспандэнт «Звязды» быў персанальным фатографам маршала Рыбалкі і пад кулямі здымаў наступленне савецкіх войскаў

**Сярод нямногіх ваенных фотакарэспандэнтаў, якім пашчасціла рабіць здымкі апошніх баёў Вялікай Айчыннай вайны і пераможнага шэсця савецкіх войскаў па Берліне ў маі 1945-га, быў Уладзімір Дагаеў. Фотаздымкі, што мы публікуем сёння, захаваліся ў сямейным архіве выпадкова. Гэтую адзіную стужку з дакументальнай фотахронікай апрацавала нядаўна ўнучка Дагаева, удзельніца народнага фотаклуба «Мінск» Алена Шаліма.**



Мы сустрэліся на кватэры Алены, дзе ў «творчым» пакоі беражна захоўваюцца фотапартрэты і архівы Уладзіміра Дагаева, а побач месцяцца маляўнічыя выцінанкі самой гаспадыні: Алена — народны майстар, член Беларускага саюза дызайнераў. За кубачкам духмянай гарбаты яна ўспамінае свайго знакамітага дзядулю.

— Дзед ваяваў у складзе 3-й гвардзейскай танкавай арміі пад камандаваннем маршала бранятанкавых войскаў СССР, генерал-палкоўніка Паўла Сямёнавіча Рыбалкі. Ён прайшоў праз усю вайну, быў персанальным фатографам маршала Рыбалкі. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі» ў 1943 годзе і ордэнам Чырвонай Зоркі ў 1944-м. Франтавыя ўзнагароды проста так не давалі. Вось яго ўзнагародныя лісты, дзе напісана, што «гвардыі старшы лейтэнант У.М. Дагаеў падчас баявых аперацый, знаходзячыся на перадавой лініі баявых дзеянняў нашых войскаў, з рызыкай для жыцця фатаграфаваў савецкіх байцоў і камандзіраў. Пры фарсіраванні Дняпра тав. Дагаеў атрымаў заданне зняць першыя шарэнгі наступаючых ваенных часцей, гэтую задачу ён выканаў з гонарам, нягледзячы на пастаянны варожы абстрэл. Акрамя гэтага, Дагаеў абышоў на перадавой лініі ўсе брыгады і зняў для гісторыі ўсіх герояў, што першымі фарсіравалі Днепр. Ён фатаграфаваў таксама ўвесь працэс работы па ўзвядзенні пераправы. Па заканчэнні зрабіў альбом-хроніку пра тое, як 3-я танкавая армія фарсіравала Днепр». Другой сваёй баявой узнагароды Уладзімір Дагаеў быў удастоены «за збор гістарычных фотадакументаў падчас Львоўскай і Перамышлеўскай ваенных аперацый, а таксама пры фарсіраванні Віслы». Гэтых здымкаў, вядома, я не бачыла, яны адразу былі здадзены ў армейскія архівы.

Ужо пасля смерці дзеда і бабулі ў 2003 годзе Алена з маці пачалі разбіраць сямейныя рэчы і нечакана знайшлі некалькі ваенных негатываў.

— Гляджу і вачам сваім не веру: франтавая хроніка, савецкія танкі на вуліцах Берліна! Гэта была для нас сапраўды вельмі дарагая знаходка. Добра памятаю, як дзед расказваў, што пасля вайны ўсіх ваенных карэспандэнтаў абавязалі знішчыць свае асабістыя архівы. Уяўляеце, усё, што было знята за пяць гадоў пад кулямі і артабстрэлам, загадалі знішчыць... А ў дзядулі на плёнках былі не толькі дакументальныя кадры, але і творчыя работы. Вядома, некаторыя рызыкавалі. Напрыклад, Васіль Аркашоў, з якім дзед вельмі сябраваў, свае негатывы не знішчыў, а закапаў пад яблыняй у бацькоўскай вёсцы, і праз гады валодаў унікальным ваенным фотаархівам. Але гэта была вялікая рызыка. Яшчэ адзін сябар майго дзеда, фатограф ТАСС Яўген Халдзей — усім вядомы яго здымак «Сцяг над Рэйхстагам» — успамінаў, як у 1946 годзе зампаліт выкідваў на падлогу з канвертаў негатывы ваенных карэспандэнтаў, называючы іх «смеццем», бо гэты палкоўнік меў аднаасобнае права выбіраць «правільныя кадры пра вайну». Дарэчы, Халдзея ў 1948 годзе звольнілі з ТАСС па абвінавачванні ў «недастатковых адукаванасці і палітычнай свядомасці», а ў 1995 годзе Яўгену Ананьевічу Халдзею быў прысуджаны самы ганаровы ў свеце мастацтва тытул — «Рыцар ордэна мастацтваў і літаратуры».

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір Дагаеў яшчэ некаторы час служыў у Германіі, куды прывёз і сваю сям'ю. У пачатку 1950-х быў накіраваны ў Мінск, дзе працаваў фотакарэспандэнтам у найстарэйшай беларускай газеце «Звязда».

— Былыя ваенныя карэспандэнты Васіль Аркашоў, Уладзімір Лупейка, Міхаіл Ананьеў і мой дзед Уладзімір Дагаеў вельмі сябравалі, — прыгадвае Алена. — Часта па нядзелях яны збіраліся сем'ямі «на вячоркі», выязджалі разам за горад. Лупейку, памятаю, заўсёды нахвальвалі за тое, як фантастычна смачна ён саліў грыбы. Аркашоў захапляўся ігрой на драўляных лыжках, яго выступленнямі мы, дзеці, чакалі з нецярпеннем. Мае дзед і баба выдатна спявалі, асабліва бабуля. Яшчэ яна была адмысловай кулінаркай, яе пірагі з зяленівам, капустай, яблыкамі заўсёды былі галоўнай стравай на стале.



Аднак я не памятаю, каб на гэтых вячорках успаміналі вайну, распавядалі пра нейкія яе эпізоды або баі. Мне здаецца, гэтыя людзі проста жылі, атрымліваючы асалоду ад кожнага мірнага дня. Яны шанавалі свае сем'і, з асаблівым замілаваннем бавілі час з дзецьмі і ўнукамі. Адзін з першых пасляваенных фотаальбомаў называўся «Пад небам Радзімы цудоўнай», і ў ім на фотаздымках можна ўбачыць унукаў усіх вядомых фатографаў Беларусі пачатку 1960-х. Мой дзядуля — не выключэнне, я ў гэтым альбоме «засвяцілася» ажно на трох фотаздымках.

Наогул, дзіцем я была любімай фотамадэллю дзеда, ён мяне фатаграфаваў вельмі шмат і заўсёды шукаў новы ракурс, новы настрой. Гэта вайна зрабіла яго рэпарцёрам-дакументалістам, а ў юнацтве ён марыў займацца мастацкай фатаграфіяй. Мой дзядуля нават наведваў у 1929-1930 гадах курсы па творчай фатаграфіі вядомага партрэтыста Майсея Напельбаума. Дарэчы, яны там вучыліся разам з Валодзем Лупейкам. Калі б не вайна, дзед, напэўна, займаўся б студыйнай фатаграфіяй.

Дзядуля ўсяляк заахвочваў маю цікаўнасць да творчага ўспрымання наваколля. Калі мы гулялі па парку Чалюскінцаў або Батанічным садзе, ён заўсёды звяртаў маю ўвагу на лісточкі, кветкі, на мудрагелістую гульню сонечнага святла. Дзякуючы яму я набыла ўменне не проста глядзець, а бачыць.

Аднойчы дзед прынёс з рэдакцыі «Звязды» выцінанку і паказаў ёй: «Лена, глядзі, як прыгожа!» Гэта быў «малюнак» нажніцамі Вячаслава Дубінкі, тады маладога карэспандэнта газеты.

— Вядома, я і падумаць не магла, што з імем гэтага чалавека будзе звязана адраджэнне мастацтва выцінанкі на Беларусі. У першы раз папяровыя карункі на мяне асаблівага ўражання не зрабілі: падалося нейкай дзіцячай забаўкай. Іншая справа — фатаграфія! Але так склалася жыццё, што прафесіяй для мяне стала менавіта выцінанка, а фатаграфія — сур'ёзным, але ж захапленнем.

Дарэчы, Уладзімір Дагаеў быў сярод тых, хто ў 1960 годзе ўдзельнічаў у стварэнні першага ў рэспубліцы аматарскага фотаклуба «Мінск», а ў 2005 годзе Алену таксама прынялі ў гэтае творчае аб'яднанне. Свайму дзеду яна ўдзячна не толькі за Перамогу, але і за моцны падмурак мірнага творчага жыцця.

**Алена ЦЯРЭНЦЬЕВА.**
**Фота з сямейнага альбома Алены ШАЛІМЫ.**
**Яшчэ больш здымкаў — на партале zviazda.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает об открытом аукционе по продаже апартаментов в г. Сочи, находящихся в собственности Республики Беларусь и принадлежащих ГУ «Санаторий «Беларусь» на праве оперативного управления

| № лота | Описание лотов | Начальная цена с НДС, рос. руб. | Задаток, рос. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | **Апартамент № 004 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1619 с отделкой. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -2. Площадь – 99,6 кв.м.** | 14 307 266 | 1 430 726 |
| Лот № 2 | **Апартамент № 209 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1534 с отделкой. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 60,6 кв.м.** | 9 469 625 | 946 962 |

**ОПИСАНИЕ АПАРТОТЕЛЯ**

Апартаменты находятся в здании апартотеля, представляющего собой монолитное 13-этажное здание (введено в эксплуатацию в апреле 2015 г.), расположенного по адресу: г. Сочи, ул. Политехническая, д. 62, в одном из самых экологически чистых районов, на круглосуточно охраняемой территории государственного учреждения «Санаторий «Беларусь» в непосредственной близости от государственной дачи «Бочаров ручей». Апартотель расположен на земельном участке с кадастровым № 23:49:0203004:21 площадью 155 600 кв.м, предоставленном государственному учреждению «Санаторий «Беларусь» на праве аренды по 22.09.2062. Разрешенное использование земельного участка – для размещения и эксплуатации зданий и сооружений санатория.

**УСЛОВИЯ**

К участию в аукционных торгах допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица без ограничения, вне зависимости от государственной принадлежности, внесшие задаток по 01.06.2016. В качестве участника аукциона регистрируются лица, задаток которых поступил на расчетный счет Организатора аукциона на момент подачи заявления на участие в аукционе с иными необходимыми документами.
Валюта торгов – российский рубль. Валюта платежа — российский рубль.
Задаток за участие в аукционных торгах устанавливается в российских рублях. Сумма для оплаты задатка за участие в аукционе для резидентов Республики Беларусь производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан подписать договор купли-продажи Объекта (Объектов) с Продавцом в течение 5 (пяти) дней с назначенной даты аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 30 (тридцати) дней с назначенной даты аукциона.
Передача Победителю аукциона (Претенденту на покупку) пакета документов для регистрации (оформления) права собственности осуществляется только после оплаты полной стоимости Объекта (Объектов).
Государственная регистрация договора купли-продажи Объекта (Объектов) осуществляется Победителем аукциона (Претендентом на покупку) после полной оплаты стоимости, приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) и получения перечисленной суммы Продавцом.
Все расходы по удостоверению, составлению и оформлению договора купли-продажи, уплате государственной пошлины оплачиваются Победителем аукциона (Претендентом на покупку).
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Запрет на изменение фасадной части.
Платежи и расчеты с резидентами и нерезидентами Республики Беларусь осуществляются в соответствии с законодательством Республики Беларусь, регулирующим расчеты при проведении валютных операций.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609 и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 5% от стоимости Объекта (Объектов)

**Аукцион состоится 08.06.2016 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by.**
*Задаток для резидентов Республики Беларусь перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369.*
*Задаток для нерезидентов Республики Беларусь перечисляется на текущий счет в российских рублях 3012232138035, код 739, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002 г. Минск, пр. Машерова, 29. ОКПО 37492021. ПАО «Сбербанк России» г. Москва, ИНН 7707083893, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, счет 30111810800000000154. SWIFT код SABRRUMM. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.*
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже апартаментов (Лот №__), проводимом 8 июня 2016 г.
Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь, оформление и регистрация сделки в соответствии с законодательством Российской Федерации.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений – 07.06.2016 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Кришеник Сергей Иванович: 8-10-7-862-259-60-02, 8-10-7-862-259-60-12.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Извещение о проведении 26 мая 2016 г. повторных торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества** | **Изолированное помещение (административное помещение) расположенное по адресу: г. Минск, ул. Нововиленская, 38, помещение 6, общей площадью 18,3 м²** (инвентарный номер в ЕГРНИ 500/D-708025125; наименование: административное; назначение: административное помещение) |
| **Местонахождение имущества** | г. Минск, ул. Нововиленская, 38, помещение 6 |
| **Начальная цена** | 262 288 800 рублей |
| **Сумма задатка** | 26 200 000 рублей |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |
| **Балансодержатель (должник)** | БП СП ООО «Бокемин» |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.* Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

**Аукцион проводится 26 мая 2016 г. в 15.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 11.05.2016 по 23.05.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости».**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | Капитальное строение, инв. № 412/С-24196 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), площадью 745,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Мосты, ул. Советская, 14 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 424050100015000129, (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (эксплуатация и обслуживание зданий)), площадью 0,0816, расположенный по адресу: г. Мосты, ул. Советская, 14 |
| **Начальная цена продажи** | 1 600 000 000 (один миллиард шестьсот миллионов) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 160 000 000 (сто шестьдесят миллионов) белорусских рублей |
| **Продавец** | Мостовский филиал Гроднооблпотребобщества, 231600, г. Мосты, ул. 30 лет ВЛКСМ, 1, тел./факс 8-01515-325-22 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 25 мая 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 10.06.2015**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 20 мая 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

## Аукцион состоится 07 июня 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67.

Аукционные торги проводятся в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов недвижимости и иного имущества, не относящегося к государственной собственности, а также аукционов на право заключения договоров аренды нежилых помещений, утвержденной приказом №5а от 22.01.2014 г.

| № лота | Наименование предмета торгов | Местонахождение имущества, краткая характеристика предмета торгов | Начальная цена, белорусских рублей (с НДС) | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **13 единиц оборудования для производства изделий из ПВХ** | **Местонахождение имущества: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Владимирова, 10**<br>Перечень оборудования:<br>1) станок для обработки торцов импоста мод. KM212 (2004 г.в., б/у, в технически исправном состоянии);<br>2) станок для фрезерования водоотливных канавок мод. ST263 (2004 г.в., б/у, в технически исправном состоянии);<br>3) станок экономичный углозачистной мод. CA601 (2004 г.в., б/у, в технически исправном состоянии);<br>4) копировально-фрезерный станок мод. FR224 (2004 г.в., б/у, в технически исправном состоянии);<br>5) машина горячего прессования для стеклопакетов мод. RP-1500 (2010 г.в., б/у, в технически исправном состоянии);<br>6) машина мойки и сушки стекла мод. TRW-1500 (2010 г.в., б/у, в технически исправном состоянии);<br>7) одноголовочная ПВХ-сварочная машина мод. TK501 (2004 г.в., б/у, в технически исправном состоянии);<br>8) пила для резки штапика (2010г.в., б/у, в технически исправном состоянии);<br>9) пила с изменяемым углом резки 350 мм мод. KD350 (пневм.) (2005 г.в., б/у, в технически исправном состоянии);<br>10) стенд для нанесения герм. ленты мод. TRT-1300 (2010 г.в., б/у, в технически исправном состоянии);<br>11) установка для заполнения газом мод. TRG-2 (б/у, в технически исправном состоянии);<br>12) установка компрессорная мод. СБ4/Ф-270LB75 (2010 г.в., б/у, в технически исправном состоянии);<br>13) экструдер бутила (хот-мелта) (2007 г.в., б/у, в технически исправном состоянии) | 291 960 000 | 25 000 000 |
| 2 | **Станок прямолинейной обработки кромки стекла мод. SE10M** | **Местонахождение имущества: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Владимирова, 10;**<br>2013 г.в., б/у, в технически исправном состоянии | 193 392 304 | 15 000 000 |

**Условия оплаты: возможна рассрочка платежа до 6 месяцев.**

Продавец: Открытое акционерное общество «Гомельский завод «Коммунальник», 246034, г. Гомель, ул. Владимирова, 10.

**Организатор торгов: Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Региональное инвестиционное агентство «ГомельИнвест», г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67, тел. (0232) 25 49 00, факс (0232) 25 49 01.**

*Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на р/с 3012113129041 в Региональной Дирекции №300 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369. Получатель платежа – ГП «РИА «ГомельИнвест», УНП 490779270. Назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе 07 июня 2016 г.».*

К участию в аукционе допускаются физические и юридические лица, индивидуальные предприниматели, (резиденты и нерезиденты Республики Беларусь), подписавшие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и подавшие своевременно следующие документы:

- заявление на участие в аукционе;
- платежное поручение (или иной платежный документ) о внесении задатка;

юридическими лицами (резидентами Республики Беларусь):

- доверенность представителя юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель),
- копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

представителями физических лиц (резидентов Республики Беларусь):

- нотариально заверенную доверенность;

*индивидуальным предпринимателем* – копия свидетельства о государственной регистрации;

*юридическими лицами (нерезидентами Республики Беларусь):*

- легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения,
- документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

*представителями юридических и физических лиц (нерезидентами Республики Беларусь)* – легализованная в установленном порядке доверенность.

**Документы для участия принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67 по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 по 04.06.2016 г. включительно.**

Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, подавшие в установленный срок заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявленному лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию **с 10.00 до 11.00 07 июня 2016 г.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов.

Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить предмет торгов) обязан:

- подписать протокол о результатах аукциона;
- в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения торгов возместить Организатору вознаграждение, включая фактические затраты, связанные с организацией и проведением аукциона. Размер вознаграждения составляет 4% от начальной цены проданного с аукциона объекта и 5% от суммы превышения цены продажи объекта над начальной ценой, но не менее суммы фактических расходов;
- в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов;
- в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость предмета торгов, сформированную в установленном порядке.

Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона (единственным участником, не пожелавшим купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%), возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Задаток участника аукциона, ставшим Победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), засчитывается в счет окончательной стоимости предмета торгов.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (единственным участником) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет десять базовых величин за каждый случай нарушения.

Продавец вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Справки по тел. (029) 679 02 81.

# ГЭТА ЗАЛЕЖЫЦЬ АД НАС З ВАМІ

## Пасол Расійскай Федэрацыі аб тым, што важна памятаць не толькі ў Дзень Перамогі

**Сустрэча з Аляксандрам СУРЫКАВЫМ, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь, напярэдадні 9 Мая вызначыла тэму інтэрв'ю. У той жа час рамкі гэтай тэмы можна пашыраць да бясконцасці, бо дарагой цаной здабытая 71 год таму Перамога — гэта не толькі памяць, не толькі пашана да тых, хто годна прайшоў праз цяжкія выпрабаванні і выстаяў, гэта само наша жыццё. І наша адказнасць за тое, каб атрыманы ў 1945 годзе мір захаваць.**



Фота Надзеі БУЖАН.

### НЕБЯСПЕКА ВЫКЛЮЧНАСЦІ

***— Аляксандр Аляксандравіч, Дзень Перамогі дзе будзеце святкаваць?***

— У Беларусі. І ўсе сваякі сюды прыедуць. Летась таксама тут былі.

***— 9 мая — дата, якая аб'ядноўвае не толькі Беларусь і Расію. Пацвярджэнне таму нядаўні міжнародны форум пераможцаў «Вялікая Перамога, здабытая адзінствам»...***

— Так, у ім бралі ўдзел прадстаўнікі ўсіх без выключэння былых савецкіх рэспублік.

***— Ці не здаецца вам, што для старэйшага пакалення Дзень Перамогі мае значна большае значэнне, чым для маладога? Калі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны з намі не застанецца, ці здолеюць яны знайсці тое, што нас так моцна аб'ядноўвае?***

— Гэта залежыць і ад нас з вамі. Як мы выхаваем сваіх дзяцей, як паднясём тыя падзеі маладому пакаленню, так яно і ўспрыме, так і будзе разумець. На жаль, падзеі Вялікай Айчыннай вайны шмат у чым пачалі рэтушавацца і фальсіфікавацца. А пра саму ідэю, якая зрабіла вайну магчымай, усё часцей маўчаць. Мы гаворым пра перамогу, пра вызваленне Беларусі ў 1944 годзе, а што ж на самой справе адбывалася? Чым, які трагедыяй магло скончыцца? Менавіта гэта павінны ўсе разумець і памятаць!

Калі будзе разуменне прычын Другой сусветнай вайны, то і маладое пакаленне будзе знаходзіць агульныя каштоўнасці.

***— Такога разумення не хапае?***

— Калі казаць пра краіны, якія ўваходзілі ў Савецкі Саюз, які з саюзнікамі атрымаў перамогу ў той вайне, то гэта разуменне ёсць не ва ўсіх. Прама скажам, яго не хапае нашым прыбалтыйскім калегам. Там раптам з'явіліся акцэнты нацыянальна-вызваленчай барацьбы ўнутры Вялікай Айчыннай. Ва Украіне таксама робяць акцэнт на нацыянальна-вызваленчай барацьбе ўнутры Вялікай Айчыннай — у заходніх абласцях. У некаторых дзяржавах замоўчваюць тыя падзеі.

Ёсць пэўныя недапрацоўкі і ў нас. Таму што мы ў Расіі стараемся коўдру Перамогі нацягнуць чамусьці больш на сябе. Мы вельмі шануем гэтыя рэчы і часам забываем, што вайну выйграў САВЕЦКІ народ. І тым самым закранаем пачуцці братоў па зброі.

Трэба яшчэ раз уважліва прааналізаваць нашу працу з моладдзю, з пакаленнем, якое прыйдзе ў жыццё, ва ўладу, расставіць правільна акцэнты выхаваўчай і патрыятычнай працы на тых падзеях і ключавых прычынах узнікнення тых падзей...

Бо асноўная прычына была — пабудова сацыялізму для адной нацыі, ідэалогія Нацыянал-сацыялістычнай рабочай партыі, якую ў 1921 годзе ўзначаліў Адольф Гітлер. Згодна з гэтай ідэалогіяй, усе астатнія нацыі другасныя — яны павінны былі абслугоўваць расава чыстую арыйскую дзяржаву, а некаторыя падлягалі знішчэнню. Гэта было галоўнай прычынай распальвання вайны, але пра гэта мала кажуць.

Трэба ўсё гэта асэнсаваць і сказаць: калі б тады адна нацыя прыйшла да сусветнага панавання, то якой была б цяперашняя моладзь — беларуская, расійская, іншая? Напэўна, такой, як дзеці неграў на плантацыях у амерыканскіх паўднёвых штатах да 1865 года.

Нам самім важна разумець, што нас аб'ядноўвае не проста факт барацьбы са зброяй у руках. А тое, дзеля чаго плячом да пляча ваявалі дзяды і прадзеды сённяшніх маладых людзей, якія жывуць у розных цяпер краінах на постсавецкай прасторы.

***— І супраць чаго.***

— Так, і супраць чаго. Гэта самае галоўнае. І выхоўваць моладзь трэба так, каб падобнае не магло паўтарыцца. Бо моцных дзяржаў на планеце шмат. Важна, каб прадстаўнікам гэтых дзяржаў у галаву не прыйшлі вар'яцкія ідэі аб сусветным панаванні адной нацыі. Вось у чым сэнс.

***— Такая пагроза рэальная?***

— Чаму не? Спадар Абама заяўляе ж пра выключнасць амерыканскай нацыі. Хоць і нацыі такой няма. Утрымаецца амерыканскі народ у тых рамках, якія ЗША прапагандуе па ўсім свеце: дэмакратыя, правы ўсіх людзей і іншае? Раптам нейкі радыкал з'явіцца, экстрэміст? Я ўжо не кажу пра ўзровень узбраення сусветнай супольнасці.

Таму, выбудоўваючы выхаваўчую працу, аддаючы даніну пашаны нашым продкам, трэба растлумачваць, што магло б адбыцца, калі б яны тады не аб'ядналі свае сілы супраць фашызму. І што можа адбыцца, калі, не дай Бог, падобнае паўтарыцца. І гэта залежыць і ад нас з вамі.

### ПАМЯЦЬ ЯК ЗБРОЯ

***— Чаму памяць пра Вялікую Айчынную вайну не вытрывала адносіны паміж Расіяй і Украінай?***

— Таму што мы недапрацоўваем. Мы палічылі, што калі славяне, то разам навечна, і нас нішто не разлучыць. Пусцілі сітуацыю на самацёк і атрымалі вынік.

Памяць пра тое, што ўкраінцы і рускія змагаліся разам у гады Вялікай Айчыннай вайны, руйнавалася мэтанакіравана. Яе пастаянна разбуралі праз радыкалізм заходніх абласцей, у тым ліку пэўнымі дзеяннямі нашых заакіянскіх калег — Злучаных Штатаў, і спадарыня Вікторыя Нуланд у гэтым прызнавалася. У інтарэсах Захаду адбыўся раскол паміж Украінай і Расіяй. У гэта былі ўкладзены вялікія грошы, аж да навучання і ўзбраення маладых людзей у заходняй частцы Украіны. З гэтай мэтай таксама выкарыстоўвалася памяць — аб знаходжанні гэтых абласцей у Аўстра-Венгерскай імперыі.

Адносіны паміж рускімі і ўкраінцамі знаходзяцца пакуль у стане, які не паддаецца разуменню.

***— Гэта магчыма выправіць?***

— Для гэтага трэба шмат часу і рэсурсаў. Для пачатку трэба, каб скончыліся ваенныя дзеянні на ўсходзе Украіны, каб грамадства пачало мірнае будаўніцтва без грамадзянскай вайны, каб узровень жыцця і ў Расіі, і ва Украіне павысіўся. Тады можна будзе выстройваць разумныя, нармальныя адносіны славянскіх народаў.

***— Як бы вы з гэтага пункту гледжання ацанілі настроі ў беларускім грамадстве?***

— Улады Беларусі і Расіі робяць шмат для захавання памяці пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Грамадства шануе ветэранаў і работнікаў тылу таго часу. Тлумачальная праца, у тым ліку сярод моладзі, вядзецца на сур'ёзным узроўні. Але працу гэтую трэба паглыбляць і пашыраць. У нас ёсць у пэўнай ступені «кампанейшчына» ў гэтых пытаннях. Мы акцэнтуем увагу да 9 Мая ці да 3 ліпеня, а потым як бы пра гэта забываем. А гэта штодзённая праца. Таму што, калі прыходзіць радыкал і ёсць база, на якую ён можа абаперціся, і грамадства знаходзіцца ў нязтульным стане, то гэта можа прывесці да бяды.

### ЭКАНОМІКА ЯК БАЗІС

***— Але ці не занадта мы засяроджваемся на мінулым? Можа быць, тую ж задачу яднання двух народаў лепш было б вырашаць, абапіраючыся на дзень сённяшні ці нават заўтрашні, да якога мы маглі б імкнуцца разам?***

— Па-першае, я не згодны з пасылам: «яднанне двух народаў». У нас адзін корань — Кіеўская Русь. Сёння гэты корань спрабуюць з-пад нас выдраць.

Па-другое, абапірацца на мінулае сапраўды недастаткова. З мінулага трэба рабіць высновы, каб не паўтараць памылак. Яно дапамагае выхоўваць патрыятызм, яго неабходна шанаваць. Але чалавек жыве ў сучаснасці і жыве не летуценнямі, а дзеяннямі. Адны толькі мары жыццё прыгажэйшым не зробяць, а вось дзеянняў у нас не заўсёды хапае. Таму і ў эканоміцы ёсць непрыемнасці, і жыццё людзей не заўсёды адказвае тым запатрабаванням, якія мае грамадства. Патрэбны дзеянні. Патрэбна актыўная праца ў эканоміцы, і, грунтуючыся на гэтай эканоміцы, — у сацыяльнай сферы. Калі будуць дзеянні, а не мары, то інтэграцыя і збліжэнне будуць яшчэ больш шчыльнымі.

Для гэтага ў нас ёсць усё. Напэўна, няма ніводнай дзяржавы ў свеце, якая мела б сыравіны больш, чым яе мае Саюзная дзяржава. Прычым усіх відаў: вугаль, металы, лес, вуглевадароды, зямля, чыстая вада... Абсалютна ўсё ў нас з вамі ёсць. Ёсць добра адукаванае грамадства. Патрэбны дзеянні. Не спрэчкі, а дзеянні. Мы ўсё выпрацоўваем нейкія пункты погляду. У пачатку 90-х выпрацоўвалі пункт погляду на рынак, цяпер — на эканоміку. Трэба вызначаць планы, дзейнічаць, вырашаць праблемы так, каб жыццё людзей паляпшалася.

***— Хто павінен дзейнічаць?***

— Усе разам. Безумоўна, пэўную ролю ў гэтым павінен адыграць бізнес. І бізнес больш-менш свабодны, які працуе не з-пад пугі. Вельмі важныя інтэграцыйныя працэсы ў бізнесе, таму што ў свеце ўсё большую вагу пачынаюць набіраць транснацыянальныя карпарацыі.

Улада павінна дзейнічаць у сваёй нішы: задаваць кірунак руху, выбудоўваць стратэгію і ствараць умовы для вядзення ўсіх відаў бізнесу.

Грамадства таксама павінна дзейнічаць. Гэта павінна быць адзіная запрэжка. Інакш нічога не атрымаецца.

***— У адносінах паміж Беларуссю і Расіяй існуюць нейкія прыярытэты?***

— У нас з вамі дэ-факта Саюзная дзяржава, таму не зусім правільна казаць аб прыярытэтах. Але безумоўна, у цяперашнім жыцці падмурак усяго — эканоміка. На гэтым базісе вырастае сацыяльны дабрабыт людзей, развіваюцца міжгаліновыя, культурныя сувязі. І ў нас тут акцэнт ёсць. Тавараабарот паміж, скажам, 10-мільённай Беларуссю і Расіяй у пікавы перыяд (2012 год) быў амаль 45 млрд долараў. За шэсць папярэдніх гадоў ён вырас утрая.

Гэта правільны базіс. Глабальныя працэсы ў свеце ідуць, транснацыянальныя кампаніі з рахункаў скідаць нельга, іх вытворчасці распаўсюджваюцца па ўсім свеце, і таму мы можам страціць частку сваёй сістэмаўтваральнай эканомікі. Гэта трэба ўлічваць і глыбей інтэгравацца.

***— Гэтая ідэя, наколькі разумею, закладзена і ў Еўразійскім эканамічным саюзе.***

— Структура ЕАЭС чыста эканамічная. У дакументах гэтага саюза няма ні слова пра палітыку ці пра сацыяльную сферу. Ён створаны для свабоды перамяшчэння тавараў, паслуг, капіталу і працоўнай сілы. Але пакуль мы з вамі знаходзімся ў сітуацыі, калі саюз стварылі, а рэалізаваць яго прынцыпы баімся. Баімся, што з-за рэалізацыі гэтых свабод можа часткова пацярпець нацыянальны суверэнітэт.

Але ён пацерпіць у любым выпадку: калі нашы заводы закрыюцца, мы будзем залежаць ад транснацыянальных карпарацый. Я разумею, што мы — маладыя дзяржавы, і таму моцна трымаемся за свае прынцыпы. Але яны могуць быць парушаныя зусім з іншага боку. І гэта адбываецца. Свет не падае — мы падаем. Адсутнасць раўнапраўнай, узаемазвязанай, узаемавыгаднай эканамічнай дзейнасці нам не дазваляе развівацца так, як хацелася б.

***— Даверу не хапае?***

— У тым ліку і даверу. У эканоміцы трэба, вядома, захоўваць свае інтарэсы, але так, каб яна пры гэтым магла вытрымліваць сацыяльную нагрузку грамадства, каб узровень жыцця людзей набліжаўся да ўзроўню ў высокаразвітых краінах.

### ДАРАГІ НАПРАМАК

***— Вось ужо больш за дзесяць гадоў вы працуеце на адлегласці амаль пяці тысяч кіламетраў ад дома. Гэта адчуваецца?***

— Гледзячы з якой пазіцыі. З пункту гледжання існавання ў грамадстве розніцы не адчуваю. Расійскае і беларускае грамадствы вельмі падобныя. Моўнага бар'ера няма, узаемаадносіны ўнутры грамадства аднолькавыя. Клімат крыху адрозніваецца: там халадней, больш снегу, мацнейшыя маразы, а лета больш сухое. Але я да беларускага клімату ўжо прывык. Так што не адчуваю нязручнасцяў.

***— Мая дачка марыць паехаць у Алтайскі край у якасці турысткі. Што парэкамендуеце паглядзець?***

— Гледзячы які кірунак цікавіць вашу дачку. Калі гісторыя, то можна прайсці маршрутамі старажытных качавых плямёнаў, якія рухаліся па гарах Алтая ў бок Кітая. Да гэтага часу захаваліся старажытныя курганы, і параўнальна нядаўна ў адным з іх было знойдзена забальзамаванае цела царэўны, якая памерла за некалькі стагоддзяў да нашай эры.

Можна наведаць да гэтага часу дзейны Калыванскі камнярэзны завод. Ён аднолькавы ў першапачатковым выглядзе: вада прыводзіць у рух механізм, які перадае энергію на шліфавальныя машынкі, за якімі камнярэзы апрацоўваюць яшму...

Алтай славіцца сваімі прыроднымі багаццямі. Можна прайсці тайгой, наведаць Цялецкае возера, дзе самыя вялікія пасля Байкала запасы прэснай вады на тэрыторыі былога Савецкага Саюза. Найпрыгажэйшае месца ў гарах. У возера ўпадае мноства рэк, і адна — Бія — выходзіць.

Калі ёсць спартыўная падрыхтоўка, то рэкамендую сплаўляцца па горных алтайскіх рэках. Што рэгулярна робіць спадар Лаўроў, і не толькі ён. Можна проста адпачыць на любой з турбаз, якіх існуе мноства: хоць у гарах на берагах Катуні, хоць на салёных азёрах... Прырода ў нас прадстаўлена ва ўсёй сваёй разнастайнасці: паўпустыня, стэп, лесастэп, лес, тайга, горы, горныя рэкі, азёры.

***— На ваш погляд, турыстычныя сувязі паміж Беларуссю і Расіяй развіты дастаткова?***

— Расіяне ў Беларусь едуць вельмі актыўна: і ў санаторыі, і на аграсядзібы, і проста на святы. Вы паспрабуйце месца ў гасцініцы знайсці напярэдадні 9 Мая! Летам сюды прыязджае шмат адпачывальнікаў. Беларусаў у Расію едзе менш. Таму што білет на самалёт у Заходнюю Еўропу каштуе танней. Чаму так — я не магу зразумець. Хто, навошта і для чаго гэта робіць? Выраўняйце цэны — і людзі з задавальненнем паедуць у Расію. Сваякоў жа велізарная колькасць там пражывае. А людзі, замест таго, каб наведаць родных, з-за эканамічнага фактару ляцяць у Егіпет.

Праўда, клімат у Беларусі такі, што нейкі час трэба праводзіць на моры, дзе паветра больш сухое. Але ўмовы для падарожжаў неабходна выраўняць.

***— Я хацела б вярнуцца да тэмы 9 Мая. Раскажыце, як гісторыя вашай сям'і звязана з Вялікай Айчыннай вайной?***

— Мая мама з 1932-га па 1939 год сядзела ў Кальлагу (папраўча-працоўны лагер на Кольскім паўвостраве. — **Аўт.**). Яна была арыштаваная яшчэ дзіцем разам з маёй бабуляй пасля таго, як дзед па матчынай лініі памёр у Харбіне. Ён працаваў на Кітайска-Усходняй чыгунцы. Пасля таго, як дзед пайшоў з жыцця, бабуля вырашыла вярнуцца ў Расію, была арыштавана на мяжы і адпраўлена ў Кальлаг. Там бабку адразу расстралялі, а маму з прычыны малога ўзросту пакінулі, і яна там сядзела, там жа выйшла замуж за бацьку. Ён прыехаў з Украіны — малады будаўнік. Усю вайну бацька быў у Мурманску. Узнагароджаны медалём «За абарону Савецкага Заполяр'я». Мы, мама і дзеці, былі эвакуяваны ва Ульянаўскую вобласць і да 1945 года знаходзіліся там. Потым вярнуліся.

У мамы сваякоў не было. Уся бацькава радня таксама ваявала, усе дзядзькі, многія загінулі.

***— Як ставіцеся да акцыі «Бессмяротны полк»?***

— Гэта правільна. Гэта напамін моладзі аб продках, якія аддалі жыццё дзеля таго, хто нясе партрэт загінулага ў тую вайну. Вельмі правільная акцыя. Трэба, каб такія акцыі не толькі ў Дзень Перамогі праходзілі.

***— Сваякоў 9 мая куды паведзяце?***

— Планую павесці на ўскладанне вянкоў да манумента Перамогі. Потым куды-небудзь з'ездзім. Можа быць, у Крылова. Вырашым разам. У Беларусі ёсць шмат месцаў, куды можна паехаць.

***— Любімыя?***

— Гродна, Аўгустоўскі канал. Я сам па прафесіі інжынер, і мне ўзровень інжынернай думкі тых гадоў імпануе. Сёння падобнае будаўніцтва — шараговая падзея, а ў той час такое вялікае збудаванне было адзіным у Еўропе. Цікава спляваць, паглядзець. Хацелася б з'ездзіць на аднаўленую сядзібу Агінскага. Я там быў, калі аднаўленне было ў сярэдзіне свайго цыкла. Так што туды трэба абавязкова з'ездзіць.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by*

■ Будзе падзея

# Год культуры, юбілеі класікаў

## Вызначыны прыярытэты Дня беларускага пісьменства

**Адбылося пасяджэнне арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства. Яно прайшло ў Рагачове пад кіраўніцтвам віцэ-прэм'ера Наталлі Качанавай. Менавіта ў гэтым горадзе свята адбудзецца 4 верасня.**

Дамінантамі стануць тэмы Года культуры, падрыхтоўкі да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, а таксама юбілейныя даты пісьменнікаў — Змітрака Бядулі, Кандрата Крапівы, Максіма Багдановіча, Івана Мележа і Івана Шамякіна. Пройдзе традыцыйны «круглы стол» з удзелам беларускіх і замежных літаратараў, адбудуцца навукова-практычная канферэнцыя «Рагачоўскія чытанні», конкурс юных чытальнікаў Гомельшчыны «Жывая класіка».

Ужо традыцыйнай падчас святкавання Дня беларускага пісьменства стала ўрачыстая цырымонія ўручэння Нацыянальнай літаратурнай прэміі за найлепшыя творы ў сямі намінацыях. Адметна таксама, што менавіта падчас свята пісьменства ў Рагачове распачне працу кнігарня — новы філіял ААТ «Белкніга».

Канчатковая праграма мерапрыемстваў будзе прынята да канца чэрвеня. Але ўжо стала вядома, што падчас Дня беларускага пісьменства плануецца фестываль кнігі і прэсы. У спецыяльным выставачным павільёне размесцяцца кніжныя экспазіцыі, прысвечаныя 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, пісьменнікам-юбілярам, таксама тут будуць прадстаўлены выданні-пераможцы нацыянальнага і міжнароднага конкурсаў «Мастацтва кнігі». Знарок да свята будзе падрыхтаваны і зборнік твораў пісьменнікаў з Рагачоўскай зямлі, які папоўніць серыю «Беларусь літаратурная».

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■ Вернісаж

# АРХЕАЛОГІЯ... З АЛОЎКАМІ

## Новы арт-праект Рыгора Сітніцы

**Калі звычайныя рэчы ці культурныя артэфакты, але таксама ў выглядзе матэрыяльных аб'ектаў, узводзяцца ў ранг сучаснага мастацкага стылю, набываюць духоўнае гучанне, атрымліваецца цікавы навукова-творчы эксперымент. Метафізічнае даследаванне з дапамогай самых простых мастацкіх сродкаў, паперы і алоўка, размова пра актуальнасць гісторычнага. Рыгор Сітніца прадставіў у Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў свой новы арт-праект «Прыватная археалогія».**

У цэнтры ўвагі майстра абсалютна на ўсіх работах — старажытныя аб'екты з беларускай нацыянальнай гісторыі. Гэта манеты, княжацкія пячаткі, зброя з бранёй, культавыя скульптуры. Шмат як рэлігійнага, так і патрыятычнага сэнсу. Можна ўбачыць фігуры святых, вершнікаў, што скачуць на конях, каралёў, якія размахваюць посахамі, рыцараў у разгар бою.


«Артэфакт 13».


«Артэфакт 1».

У Рыгора Сітніцы такая арыгінальная стылістыка, што яе нельга зблытаць ні з якой іншай. З аднаго боку — на карцінах усё проста, без эклектыкі, колеравых выбухаў. Ён не спрабуе здзівіць, а проста выказваецца — прама, смела, павольна. З другога боку, у работах мастака дзіўным чынам спалучаюцца элементы канструктывізму і супрэматызму. Рытміка фарбаў не перагружаная, пабудова кампазіцыі грунтуецца ледзь не на законах геаметрыі, але відавочнае гіперрэалістычнае бачанне творцы. Манета памерам з акно — ці не фантастычна? Акрамя таго, на карцінах відаць усе трэшчынкі і шурпатасці артэфактаў, яны быццам не алоўкамі заштрыхаваны, а сапраўды высечаны з медзі, каменю, дрэва.


Рыгор Сітніца падчас адкрыцця арт-праекта «Прыватная археалогія».

Багацце беларускай культуры, яе фальклору, гісторыі, мастак умее паказваць без стракатасці, залішняй пафаснай гучнасці — коратка, лаканічна, але вельмі пераканаўча. У той жа час карціны паказваюць нейкі памежны стан, а рэалізм, не губляючы сваёй сілы, дапаўняецца рысамі новай рэальнасці, абстракцыі. Раўнавага ў тэхніцы суадносіцца з унутраным рухам выяў.

Дарэчы, экспазіцыя нядаўна пабывала ў Маскве, з поспехам дэманстравалася ў Цэнтральным доме мастака на Крымскім Вале. У Мінску выстаўка працуе да 21 мая.

**Марыя ВОЙЦІК**

■ Родныя вобразы

# СКАРЫНА НА СЦЭНЕ?

## Аб'яўлены конкурс п'ес, прысвечаных першадрукару


Скарына ўжо неаднойчы станавіўся героем тэатральных пастановак, але поле для творчасці ў драматургаў ёсць.

**Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, Нацыянальная бібліятэка Беларусі і ААТ «Беларусбанк» абвесцілі конкурс твораў для драматычнага тэатра «Францыск Скарына і сучаснасць». Свае арыгінальныя, нідзе не публікаваныя і не пастаўленыя на тэатральнай сцэне работы на беларускай ці рускай мове да 31 жніўня 2016 года можа падаць кожны паўнагадовы творца, незалежна ад грамадзянства і месца пражывання. Больш падрабязна пра ўмовы і мэты конкурсу — у нашай гутарцы з дырэктарам тэатра беларускай драматургіі Уладзімірам КАРАЧЭЎСКІМ.**

— Сучасныя драматургі пішуць не так і многа п'ес, прысвечаных гістарычным асобам, знакавым постацям, іх дзейнасці, спадчыне. Таму мы вырашылі, што нацыянальны конкурс твораў для драматычнага тэатра, цэнтральным героем якіх стане Францыск Скарына, — выдатная нагода і адзначыць юбілей беларускага кнігавыдання, які шырока будзе святкавацца ў наступным годзе, і папоўніць «багаж» айчынных п'ес для тэатра. Спадзяёмся, што гэты праект прыцягне ўвагу да імя Скарыны, яго спадчыны.

***— Творчыя распрацоўкі якога кшталту будуць прымацца на конкурс?***

— Каб не абмяжоўваць памкненні драматургаў, конкурс прадугледжвае розныя намінацыі. Гэта «гістарычная п'еса», у якой будуць прадстаўленыя творы гістарычнай драматургіі, што адлюстроўваюць асноўныя этапы жыцця і творчасці Скарыны; «сучасная п'еса» — для твораў, якія паказваюць непарыўную сувязь духоўнай спадчыны Скарыны з працэсамі сённяшняга нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі, этапамі станаўлення і развіцця нацыянальнай ідэі; «п'еса па матывах» — для п'ес, напісаных паводле твораў беларускай літаратуры пра жыццё і творчасць першадрукара, «інсцэніроўкі» — дзе аўтары прадставяць драматургічныя інтэрпрэтацыі твораў беларускай літаратуры пра Скарыну. Асобна будзем разглядаць і праекты сцэнічныя ідэі — арыгінальныя задумкі па тэме конкурсу, якія патрабуюць дапрацоўкі ў садружнасці «аўтар — тэатр». Спадзяёмся, што на нашы прапановы адгукнуцца і вядомыя, і маладыя творцы. А шырыня задумкі конкурсу дае месца для ўсіх.

**Можа атрымацца і бытавая, і гістарычная, і п'еса з пафасным тэкстам. А можа, аўтары адкрыюць пра Скарыну нешта настолькі цікавае, пра што мы нават не падумалі.**

***— Чаму менавіта Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі стаў той пляцоўкай, дзе праходзіць гэтае творчае спаборніцтва?***

— Наш тэатр займаецца не толькі пастаноўкамі беларускай драматургіі, але і працуе разам з драматургамі ў кірунку стварэння п'ес для паказу іх на сцэне. Праводзіць такія конкурсы, заахвочваць маладых аўтараў — адзін з галоўных кірункаў працы нашага тэатра. Мы спадзяёмся, што ў выніку конкурсу з'явяцца творы, цікавыя для пастаноўкі на тэатральных пляцоўках, у першую чаргу на сцэне нашага тэатра. Мы сапраўды адчуваем недахоп цікавага сучаснага матэрыялу, створанага айчыннымі драматургамі. А хацелася б атрымаць п'есу, якая займее цікавае і доўгае жыццё, стане сапраўды нацыянальным прадуктам, здольным прадставіць нашу краіну і за мяжой, у тых месцах, дзе жыў і працаваў Скарына.

Спадзяюся, што драматургі зацікавяцца конкурсам. Бо ён прадугледжвае не толькі маральную ўзнагароду, але і матэрыяльную — нас падтрымаў галоўны банк краіны — Беларусбанк. Гэта добрая дапамога і для творцаў, і для тэатральнай дзейнасці краіны ў цэлым.

***— У жыцці Скарыны яшчэ застаецца шмат загадак, не ўсе таямніцы яго лёсу раскрыты навукоўцамі. Ёсць і рызыка пэўнага кшталту развянчання ідэальнага вобразу першадрукара ў тэатральнай пастаноўцы. Не баіцеся гэтага?***

— Не трэба гэтага баяцца. Мы ўсе жывыя людзі, зрэшты, і Скарына таксама быў проста чалавекам. Я думаю, што сёння людзі больш інфармаваныя, чым раней, таму і да жыцця ставяцца больш прагматычна. Скарына, як і ўсе мы, мог рабіць памылкі. Але тым не менш яго імя, памяць пра яго вялікую справу жыве. Спадзяюся, што з дапамогай конкурсу і сцэнічнага ўвасаблення конкурсных работ вобраз першадрукара стане нам бліжэйшым, мы на яго асобу паглядзім не толькі як на помнік, ікону. Дарэчы, мне вельмі цікава, як драматургі папрацуюць з гэтым вобразам. Можа атрымацца і бытавая, і гістарычная, і п'еса з пафасным тэкстам. А можа, аўтары адкрыюць пра Скарыну нешта настолькі цікавае, пра што мы нават не падумалі. Творцы, якія будуць працаваць з матэрыялам, змогуць звярнуцца да першакрыніц, завітаюць у Нацыянальную бібліятэку, дзе захоўваюцца арыгіналы скарынаўскіх выданняў.

***— Ужо вызначаны склад журы?***

— Хутка адбудзецца пасяджэнне аргкамітэта конкурсу, дзе будзе вырашана, хто ўвойдзе ў склад журы. Натуральна, у яго складзе будуць прадстаўнікі арганізатараў, але плануем прадставіць тэатральных крытыкаў, маладых, але ўжо досыць вядомых, якія добра ведаюць сучаснае айчыннае і замежнае тэатральнае мастацтва. Таксама плануем запрасіць кансультантаў-гісторыкаў, чыя прафесійная праца звязана з вывучэннем спадчыны першадрукара. Думаю, што ў журы не будзе драматургаў — каб пазбегнуць магчымых прафесійных лобі.

***— А як хутка можна будзе пабачыць пастаноўку хаця б адной з п'ес-пераможцаў на сцэне?***

— Наступны тэатральны сезон — юбілейны для нашага тэатра. У лепшым выпадку вынікі конкурсу, якія будуць падведзены якраз у пачатку сезона, мы зможам адразу ж прадставіць пастаноўкай на сцэне.

***— Супрацоўніцтва драматургаў і рэжысёраў для вашага тэатра — справа звыклая?***

— Так, Цэнтр беларускай драматургіі, што існуе пры нашым тэатры, даўно працуе з драматургамі, рэжысёрамі. Напрыклад, ужо трэці раз будзе праходзіць міжнародная лабараторыя, дзе сустракаюцца драматургі, рэжысёры, распрацоўваюць тэмы і новыя п'есы. Але такі маштабны нацыянальны конкурс на такую сур'ёзную тэму мы праводзім упершыню.

***— У рэпертуары тэатра ўжо ёсць спектаклі, прысвечаныя знакавым постацям беларускай культуры? І ў цэлым, ці патрэбны такія пастаноўкі айчыннаму гледачу?***

— Такія пастаноўкі, безумоўна, патрэбны. У нашым рэпертуары ёсць эксперыментальны спектакль рэжысёра Віталя Баркоўскага «Дзённік паэта», прысвечаны Максіму Багдановічу. Ён нечаканы і неадназначны, але тым не менш цікавы. Таксама ёсць спектакль «Янка Купала: кругі раю», прысвечаны Купалу і яго творчасці. Пастаноўка, падрыхтаваная Святланай Навуменкай, створана на аснове творчасці песняра, дакументаў, звязаных з яго жыццём і працай. Спадзяюся, што хутка наш тэатр зладзіць і спектакль пра Францыска Скарыну.

***З палажэннем конкурсу, дзе падрабязна акрэслены ўмовы падачы работ, можна пазнаёміцца на інтэрнэт-сайтах арганізатараў — Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, Беларусбанка і партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.***

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■ Прэм'ера

# ЯК У КІНО. НЕ НЯМЫМ, А МУЗЫЧНЫМ

## Шукайце яго ў нашых тэатральных афішах

**Хоць аперэта Пала Абрахама «Баль у Савое» ніколі не ішла ў беларускім тэатры, для знаёмства нашай публіцы прадстаўлены не самы прымітыўны яе варыянт (усяго іх некалькі). Лібрэта, паводле якога створана пастаноўка, набылі ў тэатра «Маскоўская аперэта». Такім чынам, у Музычным тэатры ёсць магчымасць пазнаёміцца з яркай святочнай пастаноўкай, ды яшчэ і пабываць на кінафестывалі.**



Менавіта атмасфера прэстыжнага фестывалю кіно, які нібыта праходзіць недзе на фешэнебельным курорце, створана пастаноўшчыкамі аперэты. Нам прапануюць перанесціся ў час, калі кіно яшчэ было нямое і толькі чакаўся яго пераход да гуку — 20-я гады мінулага стагоддзя. Тады ў кіно прамаўляла якраз музыка. Той час ствараў атмасферу для развіцця творчай свабоды, якая праяўлялася нават у рытмах — здаецца, зусім няправільных, ірваных, як, напрыклад, у джазе. Але менавіта яны і зачаравалі.

Аперэта Пала Абрахама «Баль у Савое», створаная ім у той час, якраз ілюструе эпоху — гучыць шмат рознай музыкі. Ён сам быў аўтарам музыкі да першых фільмаў, калі нямое кіно пераходзіла да гуку. Таму ёсць рацыя ў тым, што ў пастаноўцы адной з самых паспяховых аперэт кампазітара «Баль у Савое», якая з'явілася ў афішы Музычнага тэатра Беларусі, абыгрываецца менавіта гэты перыяд.

І яго пачуццёвасць. Галоўныя героі — «зоркі» кіно (паводле нашай версіі) Мадлен Цібо і Арыстыд Дзюбуа сустракаюцца ў гатэлі, куды прыязджаюць як зоркі фестывалю. Але каб пазнаёміцца з прыгажуняй-«зоркай», Арыстыд пераадзяваецца ў служку гатэля. Нават у такім аблічы яна ацаніла яго розум. Мадлен (спявала Наталля Дзяменцьева) з першай сустрэчы закахалася ў Арыстыда (Сяргей Суцько), не ведаючы, хто гэта. Але ў фешэнебельным гатэлі «Савой» было вельмі шмат гасцей. Нагул колькасць герояў у спектаклі значна павялічылася. Зразумела, чаму: абыгрываючы тэму кіно, немагчыма абысці тэму «зорак». У гатэлі збіраецца запрошаная «зорная» публіка: напярэдзе раздача прызоў, банкет, канцэрт. Усё пра ўсіх тут ведае хіба што адзін чалавек — Памероль, адміністратар Гранд Гатэля (артыст Дзяніс Нямцоў). З-за яго камзола і ўзнікае непаразуменне паміж прыгажуняй Мадлен і кінарэжысёрам, сцэнарыстам і пісьменнікам Арыстыдам Дзюбуа. У нейкі момант яна заблытваецца, хто ёсць хто.

Кароткая аперэта ператварылася ў даволі працяглы спектакль, дзе ёсць яшчэ стасункі таленавітага джазавага кампазітара-пачаткоўца Дэзі Дарлінгтан (Наталля Глух) і яе таты-мільянера. Настырная дзяўчына ўпарта ідзе да мэты, не зважаючы на інтрыгі таты. І нават знаходзіць сабе прадзюсара Мустафу-бея (Сяргей Спруць). Мусульманін, якому дазволена мець некалькі жонак, задумваецца пра тое, што яму, магчыма, хопіць адной Дэзі. Яна ў спектаклі выконвае ролю інтэрактыўнага персанажа: праз яе пакідае аркестравую яму і выходзіць на сцэну нават дырыжор-пастаноўшчык спектакля Мікалай Макарэвіч. Дзяўчына скарае публіку сваім гарачым выступленнем нават без спадніцы. Свет шоу-бізнесу непрадказальны. Але талент сябе сцвердзіць абавязкова.

У гэта маглі верыць якраз у той час. Кіно было самым яркім доказам таго, што ў свеце ўсё можа быць магчыма — калі за справу бярууца таленавітыя людзі. Рэжысёр пастаноўкі Ала Маторная прыцягвае імёны са свету кіно, на якія можа купіцца глядач: Феліні не здымаў у той час, але, можа быць, гэта не той, а іншы рэжысёр, проста мы не ведаем. Людзі з камерамі, мітусня, чырвоныя дарожкі... Атмасфера свята, за якім мы назіраем нібыта з-за заслоны (ці з-за экрана?) Кіно патрэбна як вобраз прыгожага і прывабнага жыцця. Але ў ім дастаткова сваіх драм, узлётаў, падзенняў і нават разарэнняў. Ці даруе Мадлен Арыстыду? Ці пазбегне ганьбы і самазабойства прадзюсар, які збядneў? Ці атрымае галоўную ўзнагароду былая каханка Арыстыда?

Шмат прыгожых і пазнавальных мелодый у розных стылях (чым аперэта «Баль у Савое» і вылучалася ў свой час). Як і належыць прэстыжнаму кінафестывалю, тут ёсць і ганаровыя госці: народная артыстка Беларусі Наталля Гайда выйшла на сцэну як спявачка Вуазье. Невядома, каму наша публіка радавалася больш...

Шыкоўныя сукенкі, яркія строі, прыгожыя музычныя нумары. Усё, як у кіно. Нават нямое, яно гаворыць само за сябе.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*

■ Выстаўка

# СТРАХ І ПРЫГАЖОСЦЬ У «ЦЭХУ»

## Найлепшыя фотаздымкі мінулага года ў адной экспазіцыі

**Галоўнай тэмай 59 фотаконкурсу World Press Photo, вынікі якога былі падведзены ў лютым, стаў міграцкі крызіс. У прадстаўнікоў праекта пыталіся, навошта лішні раз акцэнтаваць на гэтым увагу, калі і без таго з адпаведнымі навінамі даводзіцца часта сустракацца на старонках газет. Але арганізацыя WPP непахісная ў сваім жаданні паказваць рэчаіснасць такой, якой яна насамрэч з'яўляецца. Выстаўка пераможцаў найпрэстыжнейшага міжнароднага конкурсу фотажурналістаў пачала вандраваць па ўсім кантыненце. Пасля Галандыі, Расіі, Германіі і Польшчы Беларусь стала пятай з запланаваных сарака пяці краін, дзе адкрылася экспазіцыя World Press Photo.**

Журы конкурсу прыйшлося адбіраць з амаль 83 тысяч варыянтаў ад 5775 фатографаў са 128 краін. У выніку прэміі былі прысуджаны 41 аўтару 21 нацыянальнасці. Сярод патэнцыйных прэтэндэнтаў былі і беларусы: 25 фатографаў адправілі свае работы на конкурс, але не трапілі ў лік пераможцаў. «У нас адзін боль», — пажартаваў куратар выстаўкі Лоўрэнс Кортэвег, таму што галандскіх фотажурналістаў у спісе таксама няма. Адкрыццё экспазіцыі ў прасторы «ЦЭХ» у Мінску прыпала на 3 мая — Дзень свабоды прэсы.

Адным з першых сярод «экспанатаў» вы ўбачыце пераможцу конкурсу World Press Photo — здымак «Надзея на новае жыццё» аўстралійскага фатографа Уорэна Рычардсана. Тут паказаны момант перадачы дзіцяці праз калючы дрот на венгерска-сербскай мяжы; работа не была апублікавана ў СМІ, таму што аўтар не змог дасласць яе ў тэрмін. «Фотаздымак пачаў свае прыгоды толькі з выстаўкай, — сказаў Лоўрэнс Кортэвег. — Аўтар шмат часу правадзіў з сірыйскімі бежанцамі, на фотаздымку адлюстраваны момант, калі яны перасякаюць мяжу. Гэта няспынны марафон: сірыйцы праходзяць граніцу, паліцыя знаходзіць іх і адпраўляе назад, яны спрабуюць зноў, і так паўтараецца раз ад разу. Калі Уорэн Рычардсан далучыўся да групы мігрантаў, яны былі гэтаму не вельмі рады, але пагасілі, каб ён хацеў б не карыстаўся ўспышкай, з-за якой іх могуць заўважыць. Невядома, з'яўляюцца героі кадра адной сям'ёй альбо не — гэта не так істотна. Чыста тэхнічна гэты здымак было цяжка зрабіць, таму што асвятленнем быў толькі месяц, фатограф наўдачу націснуў кнопку фотаапарата, скіраванага ў цэмру. Гэта работа падкупіла журы, таму што была зроблена амаль выпадкова, але ў нейкім сэнсе перадала сутнасць міграцкага крызісу».

Экспазіцыя World Press Photo паказвае ўвесь 2015 год, яго нядзённае і характэрнае, папулярнае і малавядомае, уражальнае і нечаканае. Яна адлюстроўвае незнаёмыя далёкія светы (і нават закрытыя, як Паўночная Карэя ў праекце Дэвіда Гутэнфельдэра «Жыццё ў кульце Кімаў»). Паказвае стужку навін, толькі іншым, больш уважлівым і спагадлівым, вокам — вокам бясстрашнага фотажурналіста, які не баіцца трапіць у гушчу страшных і непрадказальных падзей, не баіцца праўды. На фотаздымках — бежанцы, наступствы тэрактаў, авіяўдараў альбо землятрусаў, надзённыя экалагічныя праблемы, сутычкі з паліцыяй на глебе расізму. І людзі. Якія хвараюць на рак (неверагодная серыя «Жыццё ў смерці» пра хворых мужа і жонку, аўтарам якой стала іх дачка — Нэнсі Боравік), якія страчваюць блізкіх, якія выказваюць свой пратэст, якія гуляюць у хакей, якія разгубіліся перад жыццём. Самая рэалістычная рэальнасць у мастацтве — усё, як павінна быць. І самае галоўнае: што б ні было на фотаздымках, гэта абавязкова неверагодна прыгожа. Жыццё — такое, якое ёсць.



Куратар выстаўкі World Press Photo Лоурэнс КОРТЭВЕГ расказвае пра пераможцу — фотаработу «Надзея на новае жыццё»

Незалежная арганізацыя World Press Photo, якая базуецца ў Амстэрдаме, была створана яшчэ ў 1955 годзе. Яна займаецца падтрымкай прафесійнай фотажурналістыкі (дарэчы, летась адным з пераможцаў конкурсу ўпершыню стала работа, зробленая на мабільны тэлефон) і прысуджэннем найпрэстыжнейшай у гэтай галіне прэміі ў дзевяці намінацыях — «Праблемы сучаснасці», «Людзі ў навінах», «Прырода» і іншых. WPP дэманструе сваю прынцыповасць як у выбары пераможцаў, так і ў праведзенні выставак. Напрыклад, у гэтым годзе адзін з выбраных журы фотаздымкаў, на якім адлюстравана пэўная палітычная фігура Турцыі, меў неадназначную рэакцыю ў гэтай краіне. Па словах Лоўрэнса Кортэвега, некаторыя турэцкія пляцоўкі выходзілі на сувязь з WPP і прапаноўвалі арганізаваць выставу, але без гэтай работы. «Мы, як арганізацыя, не можам сабе дазволіць самацэнзуру ні ў якім выглядзе, таму былі вымушаны адмовіцца ад правядзення выстаўкі World Press Photo ў Турцыі», — пракаментаваў Кортэвег.



Фота Надзеі БУЖАН.

У прасторы «ЦЭХ» размешчана 66 фотаздымкаў з ліку пераможцаў конкурсу World Press Photo, з ліку найлепшых, зробленых у 2015 годзе. Выстаўка будзе працаваць у Мінску да 24 мая.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Далучайцеся!

# З ГОНАРАМ РАСКАЗАЦЬ АБ ПРОДКАХ

## можна ў новым праекце Выдавецкага дома «Звязда» і часопіса «Роднае слова»

**У аматараў даследаваць сваё мінулае цяпер з'явіўся новы стымул для працы і творчасці. Часопіс «Роднае слова» разам з Выдавецкім домам «Звязда» ладзяць конкурс пад назвай «Памяць роду: мінулае вачыма сучаснікаў». Усё, што вы ведаеце пра выдатных сваякоў і зямлю, на якой жывяце, а таксама тое, што хацелася высвеціць, але неставала часу, цяпер можна прывесці да лагічнага завяршэння і даслаць на конкурс. А ў хуткім часе, верагодна, убачыць гэта на старонках выданняў. Пра тое, чым адметны новы праект, карэспандэнт «Звязды» пагутарыла з галоўным рэдактарам часопіса «Роднае слова» Зояй ПАДЛІПСКАЙ.**



Зоя Іванаўна адзначае, што часопіс ужо многія гады плённа супрацоўнічае з настаўнікамі і навучэнскай моладдзю краіны. Сумесна з Саюзам пісьменнікаў Беларусі раз на два гады праводзіцца рэспубліканскія конкурсы навукова-даследчых і творчых работ вучняў. Напрыклад, у 2014 годзе такі конкурс быў прымеркаваны да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Найлепшыя матэрыялы былі апублікаваны. А вынікі падводзіліся ў Доме літаратара: моладзь змагла на свае вочы ўбачыць кузню слоўнага майстэрства, адчуць адметнасць пісьменніцкай атмасферы, што само па сабе заахвочвае да працы ў выбраным кірунку. А праз гэта станоўча ўплывае на развіццё творчых і даследчых здольнасцяў.

Сёлета аўдыторыя магчымых удзельнікаў конкурсу больш шырокая. Паколькі тэма вывучэння радаводу і свайго краю надзвычай цікавая для многіх, было вырашана не абмяжоўваць колькасць удзельнікаў і пашырыць абсягі даследавання. На гэты раз свае напрацоўкі могуць дасылаць не толькі вучні IX—XI класаў, навучэнцы ўстаноў прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай адукацыі, студэнты ВНУ, але і педагогі, іншыя зацікаўленыя людзі — абсалютна ўсе ахвотныя. Найлепшыя работы будуць змешчаны на старонках часопіса «Роднае слова» і ў газеце «Звязда» ці на сайтах выданняў.

Зоя Падліпская звяртае ўвагу, што конкурс праводзіцца па трох тэматычных кірунках: «Гісторыя ўласнага роду, сям'і», «Мае гераічныя продкі», «З гісторыі родных мясцін». Матэрыялы прымаюцца да 20 кастрычніка, а вынікі будуць падведзены 1 лістапада 2016 года. Пераможцаў чакаюць дыпломы, памятныя падарункі.

Той, хто яшчэ не паспеў азнаёміцца з Палажэннем аб конкурсе, можа ўбачыць яго на сайтах часопіса «Роднае слова» і Выдавецкага дома «Звязда». Таксама яно друкавалася ў 2-м нумары «Роднага слова» за 2016 год. На сайце yasynvach.by змешчаны прыкладны ўзор конкурснай работы.

Галоўны рэдактар прыемна ўражана тым, што ўжо цяпер, на першым этапе правядзення конкурсу, свае напрацоўкі даслалі прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў Беларусі, а гэта сведчыць пра вялікую цікавасць да тэмы. Прапанаваны надзвычай адметныя работы. «Вучні даследуюць раён, горад, некаторыя правялі вывучэнне гісторыі сваёй мясцовасці на матэрыяле раённай газеты, — адзначае Зоя Падліпская. — Іншыя дасылаюць легенды роднага краю, якія запісалі ад мясцовых жыхароў падчас правядзення экспедыцый. Многіх удзельнікаў зацікавіў кірунак «Мае гераічныя продкі», дзе даследчыкі з гонарам расказваюць пра сваіх прадзедаў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны». Асноўныя крыніцы даследавання — гэта расповеды блізкіх, запісы, зробленыя ў розны час роднымі, сямейныя фотаздымкі, баявыя ўзнагароды, дадатковыя матэрыялы па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, інтэрнэт-рэсурсы, архіўныя матэрыялы і іншае.

Зоя Іванаўна прыгадала адну з работ, дзе расказваецца, як дзякуючы пошукава-даследчай працы, што праводзіцца ў школе, і зацікаўленасці нашчадкаў, удалося высветліць важны факт сямейнай біяграфіі. Прадзед аднаго з удзельнікаў конкурсу, Цімафей Анісімавіч Волкаў, які падчас Вялікай Айчыннай вайны служыў у 525-м штурмавым авіяпалку і, як лічылася раней, прапаў без вестак у 1944 годзе, насамрэч пахаваны ў Славакіі. Удалося нават адшукаць яго магілу. Такія адкрыцці не могуць не ўсцешваць. «Напярэдадні лета, у вучняў з'явіцца больш часу для адпачынку, а таксама для дапрацоўкі ўласных даследаванняў і творчых работ, — адзначае галоўны рэдактар. — Асноўная колькасць работ, думаецца, прыйдзе да нас у канцы жніўня. Некаторыя настаўнікі і вучні не могуць дачакацца, каб хутчэй надышло лета і можна было выправіцца ў экспедыцыю, адшукаць падчас вандровак патрэбныя і цікавыя звесткі».

Варта адзначыць, што сёлетняя тэма конкурсу абрана невыпадкова. Яшчэ з 2010 года рэдакцыя «Роднага слова» рэалізуе праект па выданні кніг «Я — сын Ваш» пра старажытныя роды — серыю «Летапіс беларускай шляхты» вядомага пісьменніка і даследчыка Анатоля Сташкевіча-Чабаганава. Ужо выдадзены кнігі пра дваранскія роды Сташкевічаў, Сацкевічаў-Сташкевічаў, Карафа-Корбутаў, Некрашэвічаў, Татураў, Кернажыцкіх, Сеўрукаў, Маствіловічаў, Сыцько, Арцішэўскіх, Ждановічаў-Гурыновічаў, Забэлаў і іншых. Першапачаткова многія матэрыялы з гэтых кніг прайшлі апрабацыю на старонках часопіса «Роднае слова» пад рубрыкай «Вяртанне да вытокаў» у раздзеле «Нацыянальная і сусветная культура». Кнігі былі распаўсюджаны ў бібліятэкі розных краін свету. За гэту серыю аўтар быў узнагароджаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2012 года.

«Нашы чытачы і аўтары ўжо некалькі гадоў скіраваны на правядзенне ўласнага даследавання свайго роду, — гаворыць Зоя Падліпская. — Таму тыя, з кім мы найбольш шчыльна працуем, вельмі ўзрадаваліся, што іх пошукам можна даць выхад на вялікую аўдыторыю». Зоя Іванаўна прыгадала вельмі блізкія яе душы словы народнага паэта Ніла Гілевіча з рамана ў вершах «Родныя дзеці»:

*Мы — тройчы дзеці ў вечным крузе:*
*Мы — дзеці роднае сям'і*
*І — дзеці Маці-Беларусі*
*І — дзеці Матухны-Зямлі.*
*Трайны ён, круг, ды недзялімы:*
*Бо сёння — як ні паглядзім —*
*А лёс Дзяцей, і лёс Радзімы,*
*І лёс Планеты — лёс адзін.*

«Гэты раман напісаны ў 1985 годзе, прайшло ўжо тры дзесяцігоддзі, а твор актуальны і сёння і такім застанецца яшчэ сотні гадоў, бо ён пра вечныя каштоўнасці на зямлі, — лічыць Зоя Падліпская. — Вельмі важна, каб кожны з нас разумеў, што самае галоўнае ў жыцці — гэта ўласная сям'я, свой род. Каб паважліва ставіўся да сваіх бацькоў, дзядуляў і бабуль, шанаваў памяць пра сваіх продкаў, любіў тую мясціну, дзе нарадзіўся, зрабіў першыя крокі. І разам з тым таксама ўсведамляў сябе часцінкай роднай краіны і ўвогуле нашай планеты».

— Конкурсам «Памяць роду: мінулае вачыма сучаснікаў» мы імкнёмся выхоўваць чалавечнасць, грамадзянскую адказнасць, нацыянальную самасвядомасць і, натуральна, павышаем цікавасць да гісторыі і сучаснасці Айчыны, вяртаем юныя сэрцы да іх каранёў і вытокаў, — адзначае галоўны рэдактар. — Бо, гаворачы словамі Ніла Сымонавіча з той жа паэмы, «так не можна, род звядзецца, калі магіл не шанаваць». Нам вельмі важна, каб і пасля правядзення конкурсу навучэнцы не пакідалі цікавіцца гісторыяй уласнай сям'і, імкнуліся больш даведацца пра родных людзей, ведалі і клапаціліся пра месцы апошняга спачыну сваіх продкаў, ганарыліся іх гераічным мінулым. Натхняючы нашых маладых людзей вывучаць свой род, знаходзіць і сістэматызаваць звесткі пра родзічаў, мы бачым, як яны пачынаюць больш разумець, адкуль паходзяць, а праз гэта — шанаваць мінулае, клапаціцца пра сучаснае і дбаць пра будучыню.

Нагадаем, што свае навукова-даследчыя і творчыя работы з пазнакай «На конкурс» вы можаце дасылаць на адрас рэдакцыі часопіса «Роднае слова»: пр-т Пераможцаў, 47, к.1, пад'езд 2, 220035, г. Мінск.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■

■ Жывыя традыцыі

# КАЛІ ЛАСКА, ПАВІНШУЙЦЕ ВЕТЭРАНАЎ!

**Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белпошта» сёлета, як і ў мінулыя гады, ладзіць шэраг святочных мерапрыемстваў да Дня Перамогі, нагадвае сваім кліентам аб тым, што трэба павіншаваць ветэранаў, і нават прапануе зрабіць гэта бясплатна.**




У прыватнасці, у пэўных аддзяленнях паштовай сувязі (АПС) 5 мая ўсе ахвотныя маглі падпісаць паштовыя карткі ўдзельнікам Вялікай Айчыннай: павіншаваць са святам, падзякаваць за Перамогу... Адмысловы гандлёвы пункт са святочнай прадукцыяй, фотазонай для кліентаў і магчымасцю для іх жа бясплатна адправіць весткі ветэранам 6 мая працаваў на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Курган славы», 9 мая будзе абслугоўваць кліентаў у легендарнай Брэсцкай крэпасці-героі і сталічным Лошыцкім парку. У гэты ж дзень у слынных Ушачах адбудзецца спецыяльнае гашэнне паштовых картак, прысвечанае адкрыццю мемарыяльнага комплексу «Прарыў».

Апроч таго, з 1 да 9 мая прывітальныя весткі ветэранам Гомельскай вобласці (і нават у канверце 1 класа) можна бясплатна адправіць з аддзяленняў паштовай сувязі Гомеля і цэнтральных АПС райцэнтраў Гомельшчыны; 8 і 9 мая — з АПС-25 і 27 Гродна...

Карацей, «Белпошта», як заўжды, прапануе, нагадвае і запрашае. Грэх не скарыстацца!

■


**Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:**

• оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование) • организации и проведению аукционных торгов • инвентаризации и оценке зеленых насаждений

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 07 июня 2016 г. в 11.00 состоятся ОТКРЫТЫЕ аукционные торги по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, в составе Лота № 1 (предмет торгов):**

**- Капитальное строение с инв. номером 713/С-10453 (здание арочника), общ. пл. – 801,4 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская область, Кличевский р-н, Потокский с/с, аг. Дмитриевка-2**

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509 (220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, МФО 153001369) |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | ул. Чонгарская, д. 54, г. Бобруйск, в здании Бобруйского управления филиала |
| **Начальная цена продажи и размер задатка** | **51 700 000** рублей, размер задатка – 10%, что составляет – **5 170 000** рублей |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | Получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, код 153001369 |
| **Информация о земельном участке** | Объект торгов расположен на земельном участке с кадастровым номером 723083201701000215, площадь участка – 1,5825 га по адресу: Могилевская область, Кличевский р-н, Потокский с/с, аг. Дмитриевка-2. Имущественные права на земельный участок – право постоянного пользования ООО «Завод дорожных и туковых смесей». Земельный участок для обслуживания предмета торгов будет выделен после приобретения объекта с торгов согласно законодательству Республики Беларусь |
| **Характеристика текущего состояния предмета торгов** | Здание арочника – одноэтажное, кирпичное, фундамент – бетон., кровля – метал., полы – бетон., инженерные коммуникации отсутствуют |
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Срок и условия оплаты за приобретенное с торгов имущество** | В течение 80 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на счет Организатора торгов разовым платежом либо траншами |
| **Срок подачи документов, осмотра предмета торгов и внесения задатка** | по 03 июня 2016 г. включительно до 16.00 |

**Для участия в торгах в адрес Организатора торгов необходимо предоставить**: заявление на участие в торгах; документ с отметкой банка, подтверждающий о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет; паспорт или иной документ, удостоверяющий личность; **резидентам Республики Беларусь: индивидуальным предпринимателям** – свидетельство о государственной регистрации; **юридическим лицам** – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации (копию документа о создании организации, если она не подлежит государственной регистрации); **представителю физического лица и индивидуального предпринимател**я – нотариально заверенную доверенность; **Нерезидентам Республики Беларусь:** иностранным юридическим лицам, иными организациям – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; индивидуальным предпринимателям – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителю иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иностранной организации – легализованную в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык.

**Порядок проведения торгов**: Шаг аукциона определяется в размере от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Задаток, внесенный Победителем торгов (Претендентом на покупку) будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. **В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов**. Организатор торгов (по письменному указанию соответствующей комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства) вправе снять предмет торгов с торгов в любое время до объявления его проданным

**Победитель (Претендент на покупку**) возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней со дня проведения торгов в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон и на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов, в размере 15% от начальной цены продажи

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**



ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Могилевское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

**19.05.2016 г. в 12.00 проводит повторный открытый аукцион без условий по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Агросервис» (УНП 700010487)**

| | |
|---|---|
| **ЛОТ №1 Сведения об имуществе, входящем в состав лота** | **Капитальное строение с инв. № 700/С-80719 – Профилакторий для ремонта автомобилей**; расположенное по адресу: г. Могилев, ш. Славгородское, 44а/1: общ. пл. 1038,2 кв.м, фундамент здания – ж/бетонные блоки, стены – кирпичные, перекрытия – ж/б, кровля – совмещенная рулонная. Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 740100000007004991, площадью 0,4222 га. **Капитальное строение с инв. № 700/С-80721 – Профилакторий для ремонта автомобилей**, расположенное по адресу: г. Могилев, ш. Славгородское, 44а/2: общ. пл. 377,8 кв.м, фундамент здания – ж/бетонные блоки, стены – кирпичные, перекрытия – ж/б, деревянные, кровля – совмещенная рулонная. Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 740100000007005007, площадью 0,0428 га. **Промышленная площадка для стоянки автомобилей (мощение асфальтобетонное площадью 998 кв.м) (инв. № 279/1) Ограждение кирпичное, площадью 319 м.кв. (инв. № 527/2)** |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС, руб.** | **1 805 942 400** |
| **Сумма задатка и расчетный счет для его внесения** | **180 594 200 рублей**, получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, код 369, УНП 102353509 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **19 мая 2016 года, 12.00, г. Могилев, ул. Лазаренко, 29 (офис МОУ Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»).** Регистрация заявлений на участие в аукционе осуществляется **по 18 мая 2016 года до 15.00 включительно** |
| Извещения о предыдущих аукционах были размещены в газете «Звязда» в номерах от 28.11.2015 г., от 06.01.2016 г. | |

**Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона: (8-0291) 400-394 vel.; (8-029) 624-26-25**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| Продавец | **ОАО «АЛЕВКУРП», г. Минск, ул. П. Бровки, д. 6, ком. 332** |
| Предмет аукциона | **кухня-столовая** с инвентарным номером 500/С-49614 (составные части и принадлежности: дорожка 763 кв.м, бордюр 88 м.п., газоны), общей площадью 1374,3 кв.м; расположенной по адресу: **г. Минск, ул. Славинского, д. 4К** |

**Сведения о земельных участках:** Земельный участок пл. 0.3679 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания здания кухни-столовой (ограничения прав: участок пл. 0.0462 га – охранная зона трубопроводов, участок пл. 0.0506 га – охранная зона водовода). Земельный участок пл. 0.1151 га предоставлен продавцу в общее долевое постоянное пользование (доля: 3/10) для эксплуатации и обслуживания здания кухни-столовой и зданий и сооружений военного городка №52 (проезд).

**Начальная цена с НДС 20% – 1 245 532 848 белорусских рублей (снижена на 80%)**
**С учетом деноминации – 124 553 рубля 28 копеек**

**Задаток 20%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, код 739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** банковских дней после проведения аукциона |

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано **газете «Звязда» от 27.01.2016**

**Аукцион состоится 24.05.2016 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 23.05.2016 до 17.00** по указанному адресу.
Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.**

**Продавец: Витебская областная организационная структура республиканского государственно-общественного объединения «Белорусское физкультурно-спортивное общество «Динамо», 210009, г. Витебск, ул. Лазо, 50, тел. +375 29 714-10-99.**

Лот №1. Капитальное строение с инв. №201/С-13411 по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Стодолищенский с/с, 1, южнее д. Заречье площадью 68,1 кв.м, наименование: дом охотника и рыбака, на зем.участке с кадастровым №221881300001000001 площадью 0,5555 га. Начальная цена: 21 717 900 белорусских рублей с НДС. Задаток: 4 343 580 бел. руб.

Лот №2. Капитальное строение с инв.№200/С-56221 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Шмырева, д. 44а, корп. 1 площадью 232,5 кв.м, наименование: здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения (здание лыжной базы). Капитальное строение с инв. №200/С-56223 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Шмырева, д. 44а, корп. 2 площадью 258,8 кв.м, наименование: здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения (здание восстановительного центра). Капитальные строения расположены на зем. участке с кадастровым №240100000003000088 площадью 0,2608 га. Начальная цена: 41 613 745 белорусских рублей с НДС. Задаток: 8 322 749 бел. руб.

Аукцион состоится **08.06.2016 в 10.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: **с 11.05.2016 с 8.30 по 07.06.2016 до 17.30.** Шаг аукциона – 15%. Срок заключения договора купли-продажи: 3 рабочих дня со дня проведения аукциона. Срок оплаты: 5 рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества. Обременение лота №2: регистрация в капитальном строении с инв. №200/С56221 двух граждан, не проживающих по данному адресу

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по тел: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

О Б Ъ Я В Л Е Н И Е

**Уважаемые акционеры ОАО «Мехколонна №93»**
**«23» мая 2016 года СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**ОАО «Мехколонна №93»,**

**расположенного по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 13**

Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 13, 1 этаж.

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

| № п/п | Формулировка вопроса повестки дня: |
|---|---|
| 1. | О реорганизации Общества в форме выделения из него общества с ограниченной ответственностью |
| 2. | О составе участников создаваемого в результате выделения закрытого акционерного общества |
| 3. | Об определении условий выделения общества с ограниченной ответственностью |
| 4. | Об утверждении цены выкупа акций по требованию акционеров |

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 13 (каб. 6) в период с 13 мая 2016 г. по 22 мая 2016 г. по рабочим дням с 10.00 до 16.00, либо 23 мая 2016 г. по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания – **с 10.00 до 10.50** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – «23» мая 2016 года, 11.00.**

Список лиц, имеющих права на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного на «20» мая 2016 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы:**

акционеру общества (физическое лицо) – паспорт, руководителю юридического лица, являющегося акционером, – документ, подтверждающий его должностное положение и паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100003019




## СЦЮАРДЭСА ПА ІМЕНІ ГАННА

Многія з нас хоць раз у жыцці, але ж падымаліся ў неба на самалёце. А калі не, то з кінафільмаў ведаюць, што пасажыраў там абслугоўваюць сцюардэсы. Найчасцей — маладыя, найчасцей — прыгожыя, разумныя, прыязныя дзяўчаты, якія з маленства марылі аб гэтай прафесіі. Ды і як, скажыце, не марыць, калі яна дазваляе падымацца ў неба, сустракацца з самымі рознымі людзьмі, "па сумяшчальніцтве" з працай бачыць новыя гарады, краіны, насіць блакітную элегантную форму...

Праўда, шчасціць на гэта далёка не ўсім, бо, каб стаць сцюардэсай, патрэбна многае і ці не ў першую чаргу — добрае здароўе і прывабная знешнасць: што ні кажы, а ў неба адбіраюць прыгожых дзяўчат, кожную хоць на подыум!..

Аднак бачыць сцюардэс даводзіцца не толькі там ды ў нябёсах — і на зямлі таксама.

...Прыдбаўшы некалі ўчастак для будаўніцтва дачы, я ледзь не скакала ад шчасця! Нічога не баялася: ні цяжкай працы, ні таго, што з аўтобуса далекавата ісці (і не ўлегцы)... Мы хадзілі — шэсць кіламетраў дык шэсць.

А потым, калі прадоўжылі маршрут аўтобуса, дык і наогул толькі тры засталося. Зноў нам радасць была! А ўжо ж ўражанняў...

Рэч у тым, што кандуктаркай у нашым аўтобусе працавала вельмі мілавідная дзяўчына Ганна. Рост у яе быў мадэльны — недзе пад метр восемдзесят. А вось ушыркі... Удвух за талію дакладна не абхопіш!.. Як яна з такімі габарытамі збірала плату за праезд, трэба было бачыць: акуратна, бачком, праціскалася між сядзенняў, віртуозна «лавіравала» паміж пасажырамі.

...У той дзень нас было няшмат: пару так званых дачнікаў, лічаныя вяскоўцы ды гурт нейкіх незнаёмых хлопцаў. Уваліўшыся ў салон, яны, як і варта было чакаць, адразу ж пакіравалі на заднюю пляцоўку, размясціліся там, зашумелі...

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной документацией по соответствующим земельным участкам. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

** В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, которые имеются в данном населенном пункте (массиве застройки). Подключение к указанным коммуникациям возможно только в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.*

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

## Организатор аукционов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №222185000601000050, площадью 0,1312 га по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, Тумиловичский с/с, д. Бирули, ул. Озёрная, 5 для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона водного объекта (озеро Медзозол). **Начальная цена**: 20 000 000 бел. руб. **Размер задатка:** 2 000 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600317116606 ЦБУ №209 г. Докшицы, ф-л №216 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 648, УНП 300013850, код платежа 4901, получатель платежа: Тумиловичский сельисполком |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 07.06.2016 в 10.00 по адресу: г. Докшицы, ул. Ленинская, 31 в Докшицком райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 11.05.2016 с 8.30 по 06.06.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь. **Условия аукциона:** получить техническую документацию на жилой дом и разрешение на его строительство в срок, не превышающий 1 год; в течение 1 года со дня получения свидетельства о гос.регистрации зем.участка и возникновения права на него приступить к занятию зем. участка |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221882201901000049, площадью 0,1499 га по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Вайханский с/с, д. Большое Лосвидо, ул. Озёрная, 35А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения: водоохранная зона рек, водоемов (озеро Лосвидо); охранная зона электрических сетей напряжением до 1000В. **Начальная цена**: 15 000 000 бел. руб. **Размер задатка:** 1 500 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600316027002 в ЦБУ №207 филиала №200 Витебского облуправления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300066953, код платежа: 4901, получатель платежа: Вайханский сельисполком |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 10.06.2016 в 15.00 по адресу: г. Городок, ул. Пролетарская, 2, в Городокском райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 11.05.2016 с 8.30 по 09.06.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь. **Условия аукциона:** разработка проектной документации на строительство жилого дома, получение разрешения на строительство; занятие зем.участка в течение 1 года со дня возникновения прав на зем.; снять из-под пятен застройки плодородный слой почвы и использовать его для благоустройства придомовой территории |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221288500101000195, площадью 0,1268 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, д.Андроновичи, У-3 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 52 257 000 бел.руб. **Размер задатка:** 5 225 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314130148 ф-л №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300971263, код платежа 4901, получатель платежа: Туловский сельисполком |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №221285904101000222, площадью 0,0921 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Дреколье, ул. Центральная для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Дрекольское). **Начальная цена:** 16 455 060 бел. руб. **Размер задатка:** 1 645 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314090174 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Мазоловский сельисполком |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 27.05.2016 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 11.05.2016 с 8.30 по 26.05.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь. **Условия аукциона:** получить тех. документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию зем.участка в течение 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221288503601000645, площадью 0,1327 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, аг. Тулово, ул. Южная, участок №2 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения на зем. участке отсутствуют. **Начальная цена:** 82 410 580 бел. руб. **Размер задатка:** 8 241 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314130148 ф-л №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300971263, код платежа 4901, получатель платежа: Туловский сельисполком |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №221285905601000071, площадью 0,1498 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Койтово, ул. Парковая, вблизи дома №34Б для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина). **Начальная цена:** 9 453 578 бел. руб. **Размер задатка:** 945 000 бел.руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314090174 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа Мазоловский сельисполком. Условие продажи: строительство линии электропередачи осуществляется за счет покупателя зем. участка |
| Лот №3. Земельный участок с кадастровым №221284806101000297, площадью 0,1391 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, аг. Кировская, ул.Приозерная, участок №4 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (пруд №13). **Начальная цена**: 81 035 600 бел. руб. **Размер задатка:** 8 103 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314080100 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300976663, код платежа 04901, получатель платежа: Летчанский сельисполком |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 09.06.2016 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 11.05.2016 с 8.30 по 08.06.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Условия аукциона:** получить техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию зем. участка в течение 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №240100000001013436, площадью 0,0903 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пер. Туловский, №9 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000В. Начальная цена: 247 665 748 бел. руб. Размер задатка: 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №240100000002009175, площадью 0,0842 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 8-я Чепинская, №19 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. Начальная цена: 180 424 384 бел. руб. Размер задатка: 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №3. Земельный участок с кадастровым №240100000002009174, площадью 0,0833 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 8-я Чепинская, №21 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. Начальная цена: 178 498 068 бел. руб. Размер задатка: 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №4. Земельный участок с кадастровым №240100000002009047, площадью 0,1050 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 18-я Городокская, 30 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения; водоохранная зона водного объекта (р. Западная Двина). Начальная цена: 375 885 916 бел. руб. Размер задатка: 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №5. Земельный участок с кадастровым №240100000002009046, площадью 0,1005 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 18-я Городокская, 32 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения и линий электропередачи напряжением до 1000В; водоохранная зона водного объекта (р. Западная Двина). Начальная цена: 359 776 011 бел. руб. Размер задатка: 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №6. Земельный участок с кадастровым №240100000003007407, площадью 0,1166 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пер. Сенненский 3-й, 2Б для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничений в использовании нет. Начальная цена: 313 560 820 бел. руб. Размер задатка: 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №7. Земельный участок с кадастровым №240100000003008032, площадью 0,1089 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 5-я Индустриальная, напротив базы ДСК (участок №1) для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения: охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000В; охранная зона линий связи и радиофикации. Начальная цена: 179 400 320 бел. руб. Размер задатка: 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №8. Земельный участок с кадастровым №240100000003008033, площадью 0,1111 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 5-я Индустриальная, напротив базы ДСК (участок №2) для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения: охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000В. Начальная цена: 183 027 900 бел. руб. Размер задатка: 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №9. Земельный участок с кадастровым №240100000003006981, площадью 0,0846 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Широкая, 13Д для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничений в использовании нет. Начальная цена: 244 756 720 бел. руб. Размер задатка: 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №10. Земельный участок с кадастровым №240100000003006983, площадью 0,0870 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Широкая, 13Г для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничений в использовании нет. Начальная цена: 251 697 090 бел. руб. Размер задатка: 10 000 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 26.05.2016 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 11.05.2016 с 8.30 по 25.05.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Реквизиты для внесения задатка: р/с 3642302000280 в ф-ле № 200 Витебское обл.управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. Для участия в аукционе приглашаются граждане и негосударственные юр. лица Республики Беларусь. **Условия аукциона:** получить разрешения на проведение проектно-изыскательных работ и разработки строительного проекта на строительство объекта; в течение 6 месяцев (для юр. лиц) и 1 года (для граждан) со дня утверждения проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка, разработать ПСД в соответствии с действующими ТНПА; согласовать ПСД с главным архитектором города Витебска; при необходимости произвести гос.экспертизу ПСД; получить разрешение на строительство объекта, в т.ч. при необходимости удаления, пересадки объектов растительного мира до начала строительных работ получить разрешение на произведение компенсационных посадок либо осуществление компенсационных выплат в соответствии с ПСД |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №240100000001013439, площадью 0,0901 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пер. Туловский, №11 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000В. Начальная цена: 247 105 606 бел. руб. Размер задатка: 10 000 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 14.06.2016 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 11.05.2016 с 8.30 по 13.06.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Реквизиты для внесения задатка: р/с 3642302000280 в ф-ле № 200 Витебское обл. управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. Для участия в аукционе приглашаются граждане и негосударственные юр. лица Республики Беларусь. **Условия аукциона:** срок выполнения работ подготовке проектной документации не более одного года; разработать ПСД в соответствии с действующими ТНПА; согласовать ПСД с главным архитектором города Витебска; при необходимости произвести гос.экспертизу ПСД; получить разрешение на строительство объекта, в т.ч. при необходимости удаления, пересадки объектов растительного мира до начала строительных работ получить разрешение на произведение компенсационных посадок либо осуществление компенсационных выплат в соответствии с ПСД; в течение 6 месяцев (для юр. лиц) и 1 года (для граждан) со дня утверждения проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. В аукционе допускается участие консолидированных участников (двух и более граждан, юр. лиц). **Для участия в аукционе** гражданин, юр. лицо подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр.лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; консолидированными участниками оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, а представители граждан и юр.лиц, уполномоченные должностные лица юр. лиц – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо предъявляет доверенности, выданные гражданами, юр. лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. **Условия аукциона:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: зем.участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности земельного участка. **Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by**

## Аляксандр САЛАДУХА:

# «СУМНЫ ЧАЛАВЕК ЗАЎЖДЫ ПРАЙГРАЕ»

**Гэты спявак — своеасаблівы феномен. Чалавек з простай філасофіяй, якая агаломшвае сваёй няхітрасцю. Заўжды энергічны і ўдзячны за ўсё, што мае. Песні ў Аляксандра даступныя для разумення кожнаму, нават дзецям. Пры гэтым выканаўца з іроніяй ставіцца да жартаў у свой бок і згаджаецца нават на самыя эксцэнтрычныя прапановы. Некалькі гадоў таму ён паўстаў перад усёй краінай... у вобразе матыля, які спявае, а пасля яшчэ і выканаў пародыю на сваю ж песню. Пры гэтым Аляксандр адкрыта заяўляе, што ён — мільярдэр. У беларускім грашовым эквіваленце, зразумела.**



Спявак з яшчэ маленькай дачкой Варварай.

Спявак прызнаецца, што яго ідэалы ў творчасці — Уладзімір Мулявін і Стас Міхайлаў. Дарэчы, з апошнім сябруе, яны часта бачацца, разам адпачываюць і часам працуюць. Калісьці расійскі творца нават падарыў яму песню. Прытым Аляксандр — сам сабе менеджар, піяршчык і арганізатар. Ён адкрыта расказвае, што сам тэлефануе кіраўнікам прадпрыемстваў і прапаноўвае набыць для сваіх супрацоўнікаў квіткі на канцэрт.

***— Мы ўсе гаворым пра няпростае эканамічнае становішча, людзі атрымліваюць невысокія заробкі... Напэўна, у вас стала менш канцэртаў?***

— Касавых канцэртаў цяпер трошкі менш. Справа ў тым, што праграму «Вернае сэрца», з якой мы бралі «Мінск-Арэну» ў сакавіку 2014 года, «адкаталі» па Беларусі за мінулы і пазамінулыя гады. Далі 121 сольны канцэрт. Сёлета ўсяго толькі 6 касавых канцэртаў было. Паралельна пішацца пласцінка да 2017-га, таму што ў ім адбудуцца два маіх юбілеі: 30 гадоў на сцэне (сам сабе не веру!) і чвэрць стагоддзя мегахіту «Прывітанне, чужая мілая».

**«Праз шэсць гадоў вучобы ў медінстытуце, праз пяць гадоў працы пасля яго заканчэння я ўсё адно прыйшоў на сцэну. Гэта не дае расслабіцца і гэта абавязвае трымаць планку 24 гадзіны на суткі».**

Крызіс? У гэты Новы год як ніколі шмат было заказаў на карпаратывы. Калі летась пры курсе долара, прыкладна роўным 15000 беларускіх рублёў, адбылося 15 выездаў, то ў гэтым годзе пры долары кошта ў 20000 я правёў 28 карпаратываў. Я заўжды кажу, што крызіс — для гультаёў. Таму што моцныя асобы не заўважаюць гэтага — яны займаюцца справай.

***— Ваша парада тым, хто ўсё ж такі наракае на знешнія абставіны?***

— Не ныць, а працаваць, і працаваць да поўнай знясіленасці. Верыць у сябе на 100% і працаваць з раніцы да вечара. Іншага варыянту няма і не будзе.

***— Яшчэ адна рыса, уласцівая беларусам, — збіраць грошы «ў панчоху». Вы гэта робіце?***

— Не, ніколі. Усе грошы зараз у працы. Мяне ўжо жыццё навучыла. Усё накіроўваю на новыя аранжыроўкі, машыны, дзяцей, адпачынак. У кашальку з сабой заўжды на надзённыя патрэбы ёсць парачка тысяч долараў. А так усё ўкладваю ў працу. І грошы працуюць напоўніцу! Таму толькі наперад і ўгору!

***— І ўсё ж такі сёння канкурэнцыя становіцца больш жорсткай. Як лічыце, што адрознівае вас ад іншых эстрадных выканаўцаў?***

— Пастаяннае, непамернае жаданне быць першым, быць лідарам. Я лічу, калі б кожны да гэтага імкнуўся ў сваёй прафесіі і на сваім працоўным месцы, наша жыццё было б іншым. А для гэтага патрэбна вера ў сваю справу, сілы, у сваю зорку на ўсе 100%. Будзеш верыць на 99% — нічога не атрымаецца. І не проста праца, а праца да знямогі. Гэта дапамагае быць на вяршыні.

***— Няўжо ў вас ніколі не бывае сумненняў?***

— Бываюць, сапраўды. Напрыклад, у гэты панядзелак яны ў мяне былі. Надвор'е, напэўна, адбілася на настроі. Я пайшоў да свайго суседа Сашы. А пасля мы паехалі разам у краму, набылі новы музычны інструмент. Калі селі ў машыну, упершыню пачуў па радыё сваю новую песню... І ўсё, настрой адразу выправіўся.

Безумоўна, сумненні, страхі, боязь бываюць, як у любога чалавека: ад простага рабочага да прэзідэнта. Для таго, каб іх пераадолець, у мяне ёсць настольная кніга «Унутраны фэн-шуй», у якой чорным па белым запісана 21 афірмацыя — фразы самападбадзёрвання. Яны дапамагаюць пераадольваць негатыўныя моманты: «Я моцны і здаровы», «Я непераможны», «У мяне абавязкова ўсё атрымаецца». Многія людзі губляюць свой дар таму, што баяцца, сумняваюцца, ці ўсё ў іх атрымаецца. Калі такія непрыемныя моманты ўзнікаюць, я пра сябе прагаворваю афірмацыі па некалькі разоў. Нядаўна даваў пяты па ліку майстар-клас, дзе расказваў пра гэта. Дзяліся са студэнтамі, а таксама са школьнікамі і нават супрацоўнікамі Viber вопытам таго, як усяго дасягнуць.

***— Каб спяваць, мяркую, трэба мець талент, дадзены ад нараджэння. А каб зарабляць грошы?***

— Я думаю, тут і талент патрэбен, і здольнасць вучыцца ладзіць бізнес. Нічога з самага пачатку не бывае. Усё пачынаецца з адной капейкі, пасля — шмат памылак, узлётаў, падзенняў. Пастаянна вучышся. Тут галоўнае — жадаць навучыцца. Калі зламаўся наш аўтобус, на якім мы гастралявалі па Беларусі, я вырашыў набыць новы. Значыць, трэба было на яго зарабіць, што і зрабіў.

***— У вас невычарпальны запас энергіі. Адкуль яе бераце?***

— Ад людзей, вядома ж. Калі ў панядзелак ездзілі ў краму па інструменты, пакупнікі падыходзілі, бралі аўтографы, фатаграфаваліся, здымалі на відэа... На вуліцы, на стаянках, на паркоўках часта просяць сфатаграфавацца.

Безумоўна, шмат дапамагае сям'я. Любімая жонка, дзеці, якіх у нас чацвёра на дваіх. Нашы ўнукі, якіх у нас ужо двое: Дзімасік і Сонечка. Гэта і праца, якую любіш. Новыя песні, новыя аранжыроўкі.

***— Жонка для вас аб'ектыўны крытык альбо надзейны тыл?***

— Усё разам. Жанчына, палюбоўніца, маці, гаспадыня — усё ў ёй. Пашчасціла мне з Наташай, дзякуй Богу. Гэта мая трэця афіцыйная жонка. У нас ужо падрастае дачушка Варачка, золатка наша.

***— Як жонка ставіцца да таго, што вас часта не бывае дома?***

— Яна ведае, што гэта мая праца. Здабытчык у сям'і хто? Мужчына! А жанчына — ахоўніца агача і маці, якая выхоўвае тваіх дзяцей, ахоўвае камфорт, цеплыню ў доме, падтрымлівае чысціню і парадак. Гатуе смачна, усё вымытае, папрасаванае — прыгажосць! Так што ў мяне такі падарунак ад неба.

***— Задам пытанне словамі з вашай песні. Як часта вы цалуеце «дочки своей глаза»?***

— Кожны дзень я яе абдымаю, прыцiскаю, бяру на рукі, даю бусечку раніцай, калі Наташа яе вязе ў садок, і абавязкова цалую вечарам на ноч.

***— Вы строгі тата ці не вельмі?***

— Дзіця трэба выхоўваць у любові, але варта таксама і трымаць у межах, таму мы бываем строгімі бацькамі. Але Варвара нас так цешыць! Нядаўна заняла на конкурсе першае месца, такая малайчына!

***— Вас называюць «каралём эпатажу». Вы дома такі ж, які і на сцэне?***

— Я не эпацірую. Я ўсюды такі, які ёсць. Гэта ўвогуле прыдумка сродкаў масавай інфармацыі і журналістаў. Крылы матыля пачаліць прыдумаў Першы канал тэлебачання. Зрабіць пародыю на песню «Віноград» — тэлеканал АНТ. Майстар-клас Робі Уільямсу, як збіраць «Мінск-Арэну», прыдумалі даць арганізатары канцэрта і беларускі інтэрнэт-партал. Усё гэта — прыдумкі іншых. А я проста працую, люблю спяваць і даваць сольныя канцэрты.

***— У вас ёсць мэта — пакарыць стадыёны і лядовыя палацы...***

— Гэта вяршыня ўжо даўно была ўзятая. І «Мінск-Арэна» таксама. Прэзідэнт на суботніку агучыў, што да канца 2017 года плануецца здаць стадыён «Дынама». Яго і буду браць!

***— Растлумачце, навошта вам гэта?***

— Калі чалавек для сябе ставіць новую планку, гэта стымулюе, не дае расслабляцца.

***— Вас ведаюць, прыходзяць на канцэрты, слухаюць. Як думаеце, чаму ў вас атрымалася заваяваць такую шчырую ўсенародную любоў?***

— Я заўжды марыў стаць вядомым, папулярным, каб мяне пазнавалі, фатаграфавалі, бралі аўтографы. А пасля развівацца ўсё далей і далей. Гэта як у спорце: калі калісьці перамог чэмпіянат свайго маленькага горада, ты павінен марыць аб алімпійскім залатым медалі. Стаць першым у свеце! Гэта дапамагае ўнутрана пастаянна трымаць сябе ў тонусе, працаваць над сабой. «Дрэнны той салдат, які не марыць стаць генералам». А ўсенародная любоў — гэта тытанічная праца, якая дала нараўшэ свой вынік. І гэта адчуваеш ад людзей. Гэта дабаўляе сіл, а значыць, і ты на правільным шляху. Ты ж марыў, ты ж усёй душою хацеў стаць спеваком! Праз шэсць гадоў вучобы ў медінстытуце, праз пяць гадоў працы пасля яго заканчэння я ўсё адно прыйшоў на сцэну. Гэта не дае расслабіцца і гэта абавязвае, асабліва, калі цябе называюць «каралём беларускай сцэны», трымаць планку 24 гадзіны на суткі.

Яшчэ адзін важны складнік — пастаянны стан усмешкі і радасці. Сумны чалавек заўжды прайграе і ад сябе адштурхоўвае. Любому чалавеку ўсмешка пасуе лепей, чым сумны твар. Гэта так проста! Лепей быць моцным, здаровым, багатым, шчаслівым, усмешлівым, чым бедным, хворым, тужлівым.

**Веранiка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

**БЛІЦ-АПЫТАННЕ**

**— Дзень альбо ноч?**
— І дзень, і ноч. Я люблю працаваць не толькі днём, але і ноччу. Калі цішыня, усе спяць, ты ў кабінеце за ноўтбукам...
**— Адпачынак ці праца?**
— На першым месцы — праца. Але і адпачываць люблю.
**— Слава альбо грошы?**
— Прызнанне, бо яно ўключае і тое, і другое.
**— Сям'я альбо сябры?**
— І сям'я, і сябры.
**— Бізун ці пернік?**
— Пернік.
**— Творчасць альбо рамяство?**
— Творчасць.
**— Свабода альбо абавязак?**
— Свабодны абавязак. *(Смяецца.)*
**— Думаць ці рабіць?**
— І думаць, і рабіць. Адно без другога не бывае.
**— У чым сэнс жыцця?**
— У любові.

## ■ Клопат і ўвага

# ВЕРШЫ ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ

**Незвычайную акцыю напярэдадні Дня Перамогі арганізавалі студэнты Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны. Яны не толькі дапамагаюць былым франтавікам у вырашэнні бытавых праблем, але і чытаюць для іх вядомыя творы пра вайну.**

Напярэдадні студэнты наведалі 90-гадовую гамяльчанку Аэліту Іванаўну Самсонаву. Яна яшчэ ў пятнаццацігадовым узросце добраахвотніцай трапіла на фронт. Дапамагла не адной сотні параненых. Спачатку была саніструктарам, потым скончыла курсы медсясцёр, прайшла праз ваенныя шпіталі Ташкента, Чарнігава і Гомеля. Затым — Польшча і Германія. Перамогу сустрэла ў Берліне. Цяпер, слухаючы вершы пра вайну, якія чытаюць маладыя, ветэран Вялікай Айчыннай вайны ледзь стрымлівае слёзы. Такіх эмоцый, кажа, ужо даўно не выклікалі ні фатаграфіі, ні ваенныя фільмы...

Прапанова валанцёраў, дарэчы, спачатку выклікала здзіўленне, але потым знайшла паразуменне і падтрымку. У рэпертуары — творы многіх аўтараў, ад сучасных да класікаў. У першую чаргу студэнты наведваюць самых сталых ветэранаў. Пачалі нават прымаць замовы па тэлефоне ад сваякоў удзельнікаў вайны. А 9 мая студэнты будуць чытаць ветэранам не толькі вядомыя творы, але і ўласныя вершы.

Гэта не першы паспяховы праект добраахвотніцкага атрада «Ветэран». Летась студэнты знялі каля сарака аматарскіх фільмаў пра ўдзельнікаў вайны. Так што ў Дзень Перамогі апроч традыцыйных віншаванняў гомельскіх ветэранаў чакаюць яшчэ і відэападарункі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# ПЕСНІ Ў КНІГАРНІ

## Музычны падарунак ад «Светача» — да Дня Перамогі

**5 мая ў сталічным Доме кнігі «Светач» адбыўся флэшмоб «Песні Перамогі». Студэнты другога курса Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў праспявалі знакамітую «Кацюшу» разам з супрацоўнікамі і наведвальнікамі кнігарні.**

У кніжнай краме ішоў звычайны чацвер. Аматары літаратуры спакойна барталі старонкі кніг і нават не здагадваліся, што сярод іх стаіліся будучыя акцёры музычнага тэатра. Зразумець, што хутка гэтае месца пераўтворыцца ў пляцоўку для «Песень Перамогі», можна было толькі праз незвычайную колькасць людзей з фотаапаратамі. З дынамікаў пачала гучаць музыка Мацвея Блантэра. Удзельнікі флэшмоба адышлі ад кніжных паліц і гучна заспявалі першыя радкі добра знаёмай «Кацюшы». Тыя, хто прыйшоў набыць кнігу, у якасці бонусу атрымалі музычны падарунак. Здзіўленыя пакупнікі сустрэлі ініцыятыву апладысментамі, а хтосьці нават пачаў падпяваць.

Ідэя правесці музычны флэшмоб належыць кіраўніку аддзела арганізацыі гандлю і рэкламы ААТ «Белкніга» Ганне Сіпаковай. Да Дня Перамогі «Белкніга» падрыхтавала не толькі спевы: у кнігарнях ужо стаяць асобныя стэнды з творамі на ваенную тэму.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ.**

# ЧЫТАЕМ ДЗЕЦЯМ ПРА ВАЙНУ

**Каля 300 хлопчыкаў і дзяўчынак сталі ўдзельнікамі гадзіны адначасовага чытання, якую ўжо традыцыйна ладзяць гродзенскія бібліятэкі напярэдадні Дня Перамогі ў рамках міжнароднай акцыі «Чытаем дзецям пра вайну».**

Сэнс акцыі, якая праводзіцца па ініцыятыве Самарскай абласной дзіцячай бібліятэкі, у тым, што адначасова ў розных установах (бібліятэках, школах, дзіцячых садках, сацыяльных прытулках) чытаюцца лепшыя мастацкія творы пра Вялікую Айчынную вайну. Сёлета гродзенскія бібліятэкары і літаратары чыталі дзецям ва ўзросце ад 6 да 12 гадоў творы Святланы Алексіевіч, Сяргея Аляксеева, Валянціны Асеевай, Алены Васілевіч, Валерыя Васкабойнікава, Льва Касіля, Віктара Кудлачова, Анатоля Міцяева, Канстанціна Сіманава. Да акцыі далучылася і спецыяльная бібліятэка для інвалідаў па зроку і слабавідушчых: па радыё прадпрыемства «Фільтр» грамадская аб'яднанне «БелТІЗ» прагучаў урывак з аўдыякнігі Святланы Алексіевіч «Апошнія сведкі». У 11.10 усюды, дзе праходзіла акцыя, абвясцілі хвіліну маўчання.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

# ЗНІЖКІ ДА СВЯТА

**Гандлёвыя арганізацыі сталіцы праводзяць розныя акцыі і мерапрыемствы да Дня Перамогі і знізяць цэны для ветэранаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.**

ААТ «ГУМ» 8 мая прапануе пакупнікам зніжку ў 20 працэнтаў на ўсе нехарчовыя тавары, а 9 мая будзе бясплатна арганізаваны пачастунак у кавярні па праспекце Незалежнасці, 35. УП «Кірмаш» па 10 мая прадастаўляе зніжку ў 15 працэнтаў на гадзіннікі, посуд, мужчынскія кашулі, галантарэйныя і іншыя нехарчовыя тавары.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

## ВАРТА ВЕДАЦЬ

### 9 запаветаў шашлычніка



**Запавет першы.** Самы лепшы смак смажанага мяса — гэта просста смак смажанага мяса. Плюс трошкі солі, трошкі свежамолатага перцу. Калі вельмі неабходна смак «палепшыць», трэба рабіць гэта максімальна далікатна. У якасці марынаду можна выкарыстаць нарэзаную кольцамі, трохі пацісканую, каб дала сок, цыбулю, змешаную з прыправамі — зірою, каляндрай, папрыкай. Можна дабавіць зяленіва і часнок.

У бараніну (не ягняціну, якую нічым паляпшаць не трэба) паспрабуйце дадаць жменю размятых ягад ажыны і мяту. Да курыцы падыдзе які-небудзь кісламалочны марынад, напрыклад на кефіры. А лімонны сок, віно — гэта ўжо сур'ёзныя варыянты для дастаткова цвёрдага мяса. Не кажучы ўжо пра воцат — гэта наогул на мяжы дабра і зла.

**Запавет другі.** Найлепшыя дровы для мангала — вінаградная лаза. Яна гарыць хутка, даючы моцны жар. Але гэта ідэальны варыянт, а ідэальнага нічога не бывае. Таму можна абысціся дубовымі і бярозавымі. Хвойныя і смалістыя ліставыя (накшталт асінавых) дровы не падыходзяць — з-за іх мяса будзе гарчыць. І ніякай вадкасці для распальвання агню! Нармальны мужык павінен умець развесці агонь з палачак, галінак, сухога лісця і адной-адзінай запалкі.

**Запавет трэці.** Хутчэй за ўсё — і на самым слабым жары — гатуецца рыба. Крыху больш часу трэба курыцы. Яшчэ больш — мясу. І, калі мяса можна падаваць не да канца прасмажаным, з крывёю, то рыба і курыца павінны быць цалкам прыгатаванымі.

**Запавет чацвёрты.** Адлегласць ад вугалёў да мяса ў мангале павінна быць прыкладна 4 пальцы. Не запаўняйце вугалямі ўсю ёмістасць мангала — пакіньце адзін край вольным. Туды можна будзе ссоўваць шампуры з амаль гатовым мясам, каб яно «дайшло» пры больш нізкай тэмпературы.

**Запавет пяты.** Не самы правільны прыём — перамяжоўваць кавалкі мяса на шампуры кольцамі цыбулі. Цыбуля амаль заўсёды падгарае раней, чым прасмажваецца мяса, і перадае яму свой гарэла-прагорклы водар.

**Запавет шосты.** Кавалачкі сала ўтыкаць паміж кавалкамі мяса вельмі нават правільна — для большай сакавітасці.

**Запавет сёмы.** Калі вуголле пачынае гарэць, не палівайце яго вадой, а пасыпце соллю — яна не толькі патушыць агонь, але і не дасць перагарэць тлушчу, які інакш надасць мясу гаркавы прысмак.

**Запавет восьмы.** Перад тым, як пакласці шампуры або рашотку на мангал, кіньце на вуголле пару-тройку галінак размарыну, тархуну, каб крышачку падвэндзіць мяса духмяным дымам гэтых траў.

**Запавет дзявяты.** І ніякіх хімічных кетчупаў і ўжо тым больш маянэзаў! Трэба атрымліваць асалоду ад смаку мяса самога па сабе, не трэба яго нічым заглушаць. Гародніна, свежы хлеб, соль, перац — гэтага ў якасці акампанементу, дастаткова.

## РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

### Разношваем новы абутак

**Што рабіць з туфлямі, калі яны трохі ціснуць?**

**Абгарнуць**

Добра намачыце ручнік і абгарніце ім каробку, у якой ляжаць новыя туфлі, пакіньце на ноч. Так ствараецца вільготнае асяроддзе, дзякуючы якому скура становіцца мякчэйшай, больш падатлівай. Дзякуючы гэтаму раніцай працэс разношвання праходзіць значна лягчэй. Вельмі дзейсна! Асабліва калі скура, з якой зроблены абутак, дастаткова каляная. Працэдуру, калі патрабуецца, можна паўтараць неаднаразова.

**Замарозіць**



У два трывалыя поліэтыленавыя пакеты наліваем ваду. Добра завязваем. Потым акуратна змяшчаем гэтыя запоўненыя вадой пакеты ў туфлі, каб вада апынулася якраз у тым месцы, дзе абутак ціснe. Кладзем пару ў маразілку. Вада, замярзаючы, пашыраецца і расцягвае абутак. Калі аднаго разу аказваецца недастаткова, працэдуру можна паўтарыць. Важная дэталь: не



даставайце пакеты, пакуль лёд не падтае. Каб засцерагчы абутак ад нечаканасцяў (раптам пакет акажацца не зусім трывалым), рэкамендуецца выкарыстоўваць па два пакеты на кожны чаравік, вонкавы пры гэтым не завязваць. Галоўны сакрэт — вада (у пакеце, вядома) павінна шчыльна запоўніць мысок абутку.

**Нагрэць**

Яшчэ адзін спосаб разношвання абутку — тэрмічная апрацоўка. Вазьміце фен і разагрэйце туфлі ўнутры патокам гарачага паветра, хутка апырскайце пенай-«расцяжкай» і надзеньце іх на тоўстую шкарпэтку. Як толькі абутак пачне астываць, зноў фен плюс пена — і на ногі. Дапамагае нават у зусім безнадзейных выпадках.



**Калі абутак усё ж трохі намульвае**



Вас выратуе звычайны ролікавы або цвёрды дэзадарант. Калі вы ўпершыню абуваеце новыя туфлі, нанясіце дэзадарант па баках ступні і ад пяткі да шчыкалаткі па задняй паверхні. Ён спрацуе як ахоўная змазка і засцеражэ ад пацёртасцяў.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.21 | 20.52 | 15.31 |
| Віцебск — | 5.05 | 20.47 | 15.42 |
| Магілёў — | 5.11 | 20.42 | 15.31 |
| Гомель — | 5.14 | 20.33 | 15.19 |
| Гродна — | 5.37 | 21.07 | 15.30 |
| Брэст — | 5.44 | 21.01 | 15.17 |

## Месяц

*Маладзік 06.05–12.05.*

*Месяц у сузор'і Блізнят.*

## Імяніны

**Пр.** *Елізаветы, Аляксандра, Аляксея, Валянціна.*

**К.** *Людмілы, Ружы, Вінцэнта.*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 7 МАЯ

**1861** год — нарадзіўся Рабіндранат Тагор, індыйскі пісьменнік і грамадскі дзеяч, нобелеўскі лаўрэат. Пісаць вершы пачаў з васьмі гадоў. Атрымаў добрую адукацыю — вучыўся ва Усходняй семінарыі ў Калькуце, у педагагічным вучылішчы і Бенгальскай акадэміі. У 1873 годзе разам з бацькам здзейсніў падарожжа па поўначы Індыі, якое дало яму ўяўленне пра багацце шматвяковай індыйскай культуры. У 1878 годзе апублікавана першая паэма Тагора «Гісторыя паэта». У 1891 г. Тагор пераехаў у сямейны маёнтак пад Калькутай, дзе адкрыў школу. Каб сабраць грошы на гэтую справу, быў вымушаны прадаць аўтарскае права на свае творы. У 1912 годзе ў Лондане былі апублікаваныя аўтарскія пераклады на англійскай мове твораў Тагора, пасля чаго да яго прыйшла вядомасць у Англіі і ЗША. Праз год, у 1913-м, Рабіндранат Тагор атрымаў Нобелеўскую прэмію па літаратуры. Прэміяльныя грошы ён перадаў сваёй школе. У наступныя гады здзейсніў шматлікія паездкі ў ЗША, краіны Паўднёвай Амерыкі, Еўропу, на Блізкі Усход. Атрымаў ганаровыя ступені чатырох індыйскіх універсітэтаў, ганаровую ступень доктара Оксфардскага ўніверсітэта. Тагор з'яўляецца аўтарам гімнаў Індыі і Бангладэш.

**1895** год — дзень 7 мая ўвайшоў у гісторыю сусветнай навукі і тэхнікі як дзень нараджэння радыё. Менавіта ў гэты дзень на пасяджэнні Рускага фізіка-хімічнага таварыства расійскі фізік Аляксандр Сцяпанавіч Папоў выступіў з дакладам і дэманстрацыяй стварэння ім першага ў свеце радыёпрыёмніка, ажыццявіўшы першы сеанс радыёсувязі. У 1945 годзе 7 мая ў СССР шырока святкавалася 50-годдзе з дня вынаходства радыё. У сувязі з гэтым урад краіны прыняў рашэнне лічыць гэтую дату штогадовым Днём радыё.



**1883** год — нарадзіўся (вёска Данілаўка, цяпер у Светлагорскім раёне) Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч, беларускі мовазнаўца. Акадэмік НАН Беларусі (1928). Распрацаваў тэарэтычныя асновы і прынцыпы стварэння дыялекталагічных слоўнікаў беларускай мовы. Аўтар прац па праблемах беларускага правапісу, распрацоўкі навуковай тэрміналогіі. У 1922-1925 гадах — старшыня Інстытута беларускай культуры, у 1926-1928-м — старшыня Аддзела гуманітарных навук Інбелкульта. З 1928 года — старшыня галоўнinfo навукі пры Наркамасветы БССР. У 1929 г. віцэ-прэзідэнт Беларускай АН, аднача сова з 1929 года — дырэктар Інстытута мовазнаўства. Апублікаваў больш за 30 навуковых прац, у тым ліку 4 манаграфіі. У 1930-я гады рэпрэсаваны, у 1937 годзе прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1957-м і 1988 гадах.

### Было сказана

**Анатоль СЫС, паэт:**

*«Я ж у песні не пан — толькі служка».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Сходзіў да варажбіткі, за 20 баксаў яна сказала, што сёння ў сям'і будзе скандал. Прыйшоў дадому і аблаяў цешчу. Не прападаць жа дваццатцы!**

Пара рыхтавацца да пляжнага сезона. Зрабіў тры падыходы па ўцягванні жывата.

**Пытаюцца ў закаранелага халасцяка:**

**— Якая твая самая запаветная мара?**

**Ён адказвае:**

**— Э-э-эх! Узяць бы ўсіх любімых жанчын, зляпіць у адну ды ажаніцца!**

— Значыць, цяпер ты ўсё вырашаеш?! А мая думка ўжо не лічыцца важнай?! Я вось збіраўся адпачыць зараз!

— Сярожа, перастань крычаць на ката і вымый латок.




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 1733.

Нумар падпісаны ў 19.30 6 мая 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12